РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

11 СТУДЗЕНЯ 2025 г. СУБОТА № 6 (30394)

«НАЙВЯЛІКШЫ ПОДЗВІГ НАШАГА ПАКАЛЕННЯ»

Мінск цалкам пераведзены на артэзіянскія крыніцы водазабеспячэння

Фота БелТА.

«Ліць ваду» і даваць пустыя абяцанні — не беларускі падыход. Клапаціцца аб здароўі і камфорце людзей і не шкадаваць на гэта сродкі — вось наш варыянт. Пяцігодка якасці і Год добраўпарадкавання толькі пачаліся, а ў сталіцы ўжо адбылася гістарычная падзея, з гэтым звязаная, — Мінск поўнасцю пераведзены на якасную артэзіянскую ваду. «Я ведаю, што гэта людзі запомняць назаўжды. І будуць удзячныя. Таму што паветра, вада, наша харчаванне — аснова жыцця. Не лекі. А менавіта гэта. Паветра, вада — тое, без чаго людзі жыць не могуць», — адзначаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 7 студзеня, наведваючы храм.

У 2022 годзе Прэзідэнт даручыў за 2022—2025 гады перавесці Мінск на водазабеспячэнне з падземных артэзіянскіх крыніц. У ліпені таго ж года было падпісана распараджэнне аб рэалізацыі адпаведнага інвестыцыйнага праекта. За гэты час была праведзена каласальная работа: прабураны новыя свідравіны, мадэрнізавана помпавае абсталяванне, праведзены новыя ніткі магістральных, зборных і размеркавальных вадаводаў працягласцю больш за 114 км, узведзены новыя інжынерныя збудаванні водападрыхтоўкі. На новай помпавай станцыі «Шчомысліца» кіраўнік дзяржавы ўзяў удзел ва ўрачыстым пуску артэзіянскай вады з падземных крыніц для водазабеспячэння Мінска.

СТАР. 2—3

КЛІМАТ «РАСПЛАВІЎСЯ» 11

НОВАЕ Ў ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ 12

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«Выбары мы праводзім для сваёй краіны і для свайго народа»

Старшыня Цэнтрвыбаркама Ігар КАРПЕНКА расставіў акцэнты галоўнай электаральнай падзеі

Цэнтральная выбарчая камісія ў сваёй рабоце прытрымліваецца прынцыпаў галоснасці і адкрытасці. Аб гэтым сведчыць і прэс-канферэнцыя кіраўніцтва ЦВК для журналістаў. Нягледзячы на тое, што падрабязная інфармацыя аб выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прызначаны на 26 студзеня 2025 года, размяшчаецца на сайце Цэнтрвыбаркама, сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, у медыя, яшчэ раз былі агучаны ключавыя моманты, якія датычацца бягучай электаральнай кампаніі.

«Яўка выбаршчыкаў традыцыйна высокая»

Як падкрэсліў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка, кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праходзіць у планавым рэжыме, у адпаведнасці з вызначанымі законам тэрмінамі і этапамі. «Для ўдзелу ў выбарах Прэзідэнта былі створаны зразумелыя, роўныя для ўсіх умовы, — канстатаваў ён. — На стадыі рэгістрацыі ініцыятыўных груп Цэнтральная камісія вынесла чатыры адмовы ў рэгістрацыі па безумоўных падставах. Такім чынам, усе ахвотныя заняць пасаду кіраўніка дзяржавы падалі дакументы і былі зарэгістраваны».

СТАР. 6

«НАЙВЯЛІКШЫ ПОДЗВІГ

«Думаю, мінчане гэта ацэняць»

«Горад штодня выкарыстоўвае 450 тысяч метраў кубічных вады, 330 тысяч вады з падземных крыніц было, каля 120–130 тысяч штодня пастаўлялася з наземных крыніц, у прыватнасці з Вілейскай воднай сістэмы. Для таго каб знайсці гэтыя 130 тысяч, у самім горадзе і на найбліжэйшых тэрыторыях такіх запасаў вады не было. Яны былі на адлегласці 35–40 кіламетраў ад горада. Каб падняць гэту ваду, было прасвідравана і пабудавана 87 новых свідравін, яшчэ больш за 40 перабурана. Пабудавана 114 кіламетраў трубаправодаў вялікага дыяметра», – расказаў старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў. Дзякуючы гэтаму жыхары самых буйных па насельніцтве раёнаў Мінска Фрунзенскага і Маскоўскага – а гэта практычна 800 тысяч чалавек – будуць мець у сваіх дамах чыстую ваду з падземных крыніц. Раней яны выкарыстоўвалі ваду з наземных крыніц, якая, зразумела, саступае па якасці артэзіянскай вадзе.

Цяпер мінчане могуць забыцца аб праблемах з вадой. Праект не толькі складаны тэхнічна, але і затратны фінансава. Па словах старшыні Мінскага гарвыканкама, каштарысная вартасць праекта складала 850 мільёнаў рублёў. Але падышлі па-гаспадарску. Працавалі хутка, эканомілі пры закупках, дзякуючы чаму ўдалося сэканоміць каля 150 мільёнаў рублёў. Хоць выніковая лічба ў 700 мільёнаў рублёў таксама немалая, але ж рабілі для людзей. Пры гэтым сістэма атрымання вады з наземных крыніц у горадзе захоўваецца: вада будзе выкарыстоўвацца прамысловымі прадпрыемствамі як тэхнічная, для забеспячэння энергетычнага попыту (ЦЭЦ) і абваднення Мінска.

> **«Мы вельмі шмат гаворым пра космас, пра спадарожнікі, пра палёты, пра атамныя станцыі. А гэта праект падобны на тое, але яшчэ важнейшы для мінчан», – заўважыў Аляксандр Лукашэнка.**

Усё ж практычна палова насельніцтва сталіцы жыла без артэзіянскай вады. У гэтым няма вялікай трагедыі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што большасць краін выкарыстоўваюць ваду з наземных крыніц. Але ж якасная

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

©ота БелТА.

вада – аснова жыцця. «Кажуць, у Беларусі няма карысных выкапняў. Самы карысны выкапень у нас – чыстая вада», – заўважыў ён.

І гэта не суб'ектыўная ацэнка. Па даных Праграмы развіцця ААН (ПРААН), Беларусь увахо-дзіць у топ-20 краін па забяспечанасці доступу насельніцтва да чыстай вады. У 2023 годзе Беларусь заняла 40-е месца ў сусветным рэйтынгу якасці пітной вады, апярэдзіўшы ўсіх суседзяў.

> **«Забяспечыць мегаполіс амаль у два мільёны чалавек абсалютна артэзіянскай вадой – гэта найвялікшы подзвіг нашага пакалення. Я не ведаю такіх дзяржаў, якія б з клопатам аб людзях падышлі да гэтага пытання. Мы ж маглі проста абыходзіцца тым, што ёсць. У нас была добрая вада. Але мы зрабілі ўвогуле выдатную ваду, – сказаў Прэзідэнт. – Гэта вельмі сур'ёзны праект, які рэалізаваны. Думаю, што мінчане гэта ацэняць. Нарэшце ацэняць. Гэта вялікая справа. Таму што паветра і вада – галоўнае для чалавека, для яго жыццядзейнасці».**

«За пяцігодку выходзіць нельга»

Уладзімір Кухараў далажыў, што ў горадзе заставалася тры сістэмныя праблемныя пытанні: водазабеспячэнне гарадскіх тэрыторый з падземных крыніц, пытанне ачышчальных збудаванняў і іх рэканструкцыя, будаўніцтва смецесартавальнага завода. Цяпер у сталіцы на адно праблемнае сістэмнае пытанне стала менш. Працягваецца работа над рашэннямі астатніх.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў пяцігодцы якасці, у Год добраўпарадкавання тэме ачышчальных збудаванняў, будаўніцтва завода па перапрацоўцы смецця будзе ўдзелена пільная ўвага. Ён прывёў у прыклад Швейцарыю, якая практычна ўсё смецце перапрацоўвае і атрымлівае з гэтага каштоўныя прадукты. «Нам трэба гэтым займацца, каб не загадзіць гэты кавалак зямлі, на якім трэба жыць нам і нашым дзецям», – канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Кухараў далажыў, што ў Мінску ўжо прыступілі да рэканструкцыі збудаванняў механічнай ачысткі, гэты праект падзелены на некалькі чэргаў. Што да будаўніцтва завода па сартаванні смецця, то, паводле слоў старшыні гарвыканкама, сёлета ўжо пачнуцца працэдуры таргоў па набыцці абсталявання. З улікам усіх работ да 2028 года рэальна забяспечыць рэканструкцыю ўсіх ачышчальных збудаванняў Мінска, якія будуць аснашчаны сучаснымі тэхналогіямі і забяспечаць безадходную вытворчасць.

«У наступнай пяцігодцы ўсю гэту праблему для Мінска трэба закрыць. Яна будзе раней вырашана на планах. Але за пяцігодку выходзіць нельга», – паставіў задачу Прэзідэнт. Маштабны комплексны праект па будаўніцтве ачышчальнай станцыі ў краіне рэалізоўваецца ўпершыню. Аляксандр Лукашэнка даручыў разгледзець магчымасць будаўніцтва такіх станцый у іншых буйных гарадах.

Сёння ў сталіцы рэалізоўваецца маштабны праект па рэканструкцыі магутнасцяў смеццеперапрацоўчага завода на палігоне цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) «Трасцянецкі». «Калі мы рэканструіруем гэты комплекс, нам будзе дастаткова для перапрацоўкі?» – удакладніў кіраўнік дзяржавы. Уладзімір Кухараў запэўніў, што рэканструкцыя магутнасцяў смеццеперапрацоўчага завода поўнасцю закрые патрэбы горада. «Значыць, трэба аператыўна гэта зрабіць», – запатрабаваў Прэзідэнт. Старшыня Мінскага гарвыканкама далажыў, што да 3 ліпеня плануецца поўнасцю завяршыць будаўніцтва смецесартавальнага завода.

> **«Гэта не смецце фактычна. Гэта найвялікшая справа, калі ў краіне перапрацоўваюцца тыя адходы, якія мы часам закопваем у зямлю, выкідваем проста так, – і пластык, і папера, і тканіны, і гэтак далей», – заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Пакуль жа ў Беларусі перапрацоўваецца і выкарыстоўваецца другасна не больш за 40 % смецця. Да пытання перапрацоўкі смецця ў нашай краіне падышлі ўжо даўно, губернатарам і ўраду дадзены адпаведныя даручэнні.**

«У распачатай пяцігодцы мы скончым гэтыя праекты. Падчас Года добраўпарадкавання гэтак жа нямала зробім. Але трэба, каб мы ўсе адходы перапрацоўвалі. І шкло, і пластык, і паперу, і іншае накіроўвалі ў перапрацоўку. Гэта вялізныя рэсурсы. Гэта вялізная эканомія, якая сёння не выкарыстоўваецца», – заявіў беларускі лідар.

«Мінчане будуць нам удзячныя»

Прэзідэнт паразмаўляў з людзьмі, якія падарылі Мінску чыстую якасную ваду, – будаўнікамі і работнікамі «Мінскводаканала». Ён звярнуў увагу, што гэта найважнейшая для насельніцтва работа, і падзякаваў усім, хто яе выконваў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў сталіцы робіцца вельмі шмат для зручнасці яго жыхароў. Напрыклад, нядаўна былі запушчаны тры новыя станцыі метрапалітэна, працягваецца будаўніцтва новых станцый, лініямі метро з Мінскам будуць злучаны гарады-спадарожнікі. Гэта вельмі важная справа. Але, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, без метро людзі пражылі б. А вось без вады ніяк.

«Наша пакаленне здзейсніла сапраўды подзвіг, забяспечыўшы такі мегаполіс у два мільёны найчысцейшай падземнай вадой. Таму я хачу павіншаваць мінчан. І яшчэ раз падзякаваць вам за тую вялікую працу, – адзначыў Прэзідэнт. – А цяпер водаканалаўцам трэба будзе эксплуатаваць гэтыя сістэмы, каб мінчане на нас не крыўдзіліся па забеспячэнні вадой».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, нягледзячы на дрэннае надвор'е, прыняў запрашэнне наведаць станцыю. «Я вельмі спадзяюся, адкрываючы гэту станцыю сёння разам з вамі, што сістэма будзе працаваць без перабояў і мінчане будуць нам за гэта ўдзячныя», – сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў спецыялістаў з мінулымі святамі, пажадаў ім здароўя і пераіў берагчы сябе. А Міністэрству аховы здароўя даў даручэнне – прааналізаваць эпідэмічную сітуацыю ў Беларусі. Паводле яго слоў, цяперашняе надвор'е заўсёды прыводзіць да ўсплёску захворванняў. Таму трэба прымаць дадатковыя меры да тых, што ўжо прыняло Міністэрства аховы здароўя. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў кожнага жыхара краіны ёсць магчымасць зрабіць усе неабходныя прышчэпкі. «Калі ласка – усё ў краіне закуплена таго, што не было выраблена, і лекі, каб зберагчы вас і вашых дзяцей ад хвароб. Здароўя вам!» – сказаў ён.

Дырэктар «Мінскводаканала» Фёдар Рымашэўскі падзякаваў кіраўніку дзяржавы за дапамогу і падтрымку пры рэалізацыі такога складанага, маштабнага і, безумоўна, патрэбнага для людзей праекта, як перавод Мінска на водазабеспячэнне з падземных

НАШАГА ПАКАЛЕННЯ»

крыніц. У якасці сімвалічнага падарунка ён перадаў Прэзідэнту капсулу з вадой, здабытай з артэзіянскіх свідравін, прабураных пры будаўніцтве новай помпавай станцыі «Шчомысліца».

Аляксандр Лукашэнка ў адказ на гэта звярнуў увагу, што праект сапраўды дарагі — 700 мільёнаў рублёў. І заклікаў усіх берагчы ваду.

> **«Мяне больш за ўсё турбуе тое, што мы часам бесшабашна ставімся да тых рэсурсаў, якімі валодаем. У лес пойдзеш — сумна становіцца... У сельскай гаспадарцы сёлета разбяромся: неўзараныя землі, на якіх можна атрымліваць прадукцыю. Летась мы 9 мільярдаў долараў выручылі толькі ад продажу прадуктаў харчавання. Значыць, трэба ў севазварот уводзіць. Тое ж самае па цвёрдых бытавых адходах. Тое ж самае па вадзе», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.**

Ён падкрэсліў, што вада — вельмі дарагі рэсурс. Прабурыць свідравіну, падняць ваду, прапампаваць яе, ачысціць (а нават артэзіянскую ваду трэба чысціць, каб яна стала прыдатнай для ўжывання) — гэта вельмі дарагія мерапрыемствы, і датуюцца яны са сталічнага бюджэту. Беларусы не плацяць за ваду столькі, колькі яна каштуе. «Таму беражыце, калі ласка, ваду, як і іншыя рэсурсы. Ашчаднасць заўсёды была ўласцівая нашаму народу. Трэба захаваць гэтыя падыходы», — рэзюмаваў беларускі лідар.

«Гэта для народа падарунак»

З лёгкай рукі Прэзідэнта дадзены пуск артэзіянскай вады ў сталічныя кватэры. Разам са старшынёй Мінгарвыканкама Уладзімірам Кухаравым і дырэктарам «Мінскводаканала» Фёдарам Рымашэўскім ён павярнуў сімвалічны вентыль. Кіраўнік дзяржавы таксама агледзеў абсталяванне машыннай залы помпавай станцыі. Для стварэння помпавай станцыі праведзена каласальная работа. «Было пабудавана 60 электрычных падстанцый, выкладзена 88 кіламетраў кабельных сетак, каб гэта ўсё забяспечыць электраэнергіяй», — адзначыў Уладзімір Кухараў. Якаснай вады хопіць на ўсіх. «Акрамя таго, каля 40 населеных пунктаў Мінскага і Пухавіцкага раёнаў будуць падключаны да гэтай сістэмы, каб таксама атрымліваць артэзіянскую ваду», — падкрэсліў старшыня гарвыканкама.

> **«Тое, што нашы спецыялісты ўмеюць гэта рабіць, — вялікая справа. Гэта дасягненне», — рэзюмаваў беларускі лідар.**

Частка абсталявання на станцыі замежнай вытворчасці. Паводле слоў Прэзідэнта, неабходна яшчэ раз вывучыць зносаўстойлівасць сістэм і матэрыялаў, падумаць, што з гэтага можна вырабляць у краіне.

Кіраўнік дзяржавы прадэгуставаў і артэзіянскую ваду, якая падаецца ў кватэры мінчан. «Выдатная вада! Можна разліваць у бутэлькі і прадаваць. Вельмі добрая! Гэта для народа падарунак, істотны падарунак! Як без вады жыць?!» — ацаніў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

Фота БелТА.

Меркаванні

«Самы лепшы пачатак Года добраўпарадкавання»

Міхаіл МІРОНЧЫК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Каменнагорскай выбарчай акрузе № 102:

— Правядзенне артэзіянскай вады для жыхароў Фрунзенскага раёна — гэта вялікая падзея! У нашым раёне самая вялікая колькасць людзей, і для нас якасць вады заўсёды была праблемай. Вада і водазабеспячэнне — асноўныя рэчы для жыцця. Тым больш у нашым раёне размешчана самая вялікая колькасць жылых дамоў, школ, дзіцячых садкоў, дзе чыстая артэзіянская вада — гэта проста неабходнасць! Нярэдка пры правядзенні сустрэч з насельніцтвам і прыёмаў грамадзян узнімалася пытанне якасці вады ў Фрунзенскім раёне, тэма была сапраўды актуальная. Упэўнены, што цяпер кожны жыхар маёй акругі ўдзячны кіраўніцтву нашай краіны і горада за такі цудоўны падарунак.

Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Заходняй выбарчай акрузе № 101:

— Упэўнена, жыхары Фрунзенскага раёна сталіцы па-сапраўднаму шчаслівыя. Цяпер і ў іх кватэры пачне паступаць вада з артэзіянскіх крыніц. На працягу ўсяго майго дэпутацтва пытанне якасці пітной вады было ў топе на асабістых прыёмах грамадзян і сустрэчах у працоўных калектывах. Дзякуючы асабістай ініцыятыве і кантролю кіраўніка дзяржавы пытанне вырашана. Яго вырашэнню папярэднічала каласальная работа ўсіх зацікаўленых і вялізныя інвестыцыі. І наша сацыяльная дзяржава не пабаялася ўвязацца ў такі няпросты праект дзеля павышэння якасці жыцця грамадзян. Чыстая вада — гэта не толькі здароўе, але яшчэ і эканомія: калі яна цячэ на кухні з крана і не трэба несці дадатковыя выдаткі на лакальныя сістэмы фільтрацыі або набыццё бутыляванай вады. Жыхары маёй акругі могуць ужо сёння смела выпіваць рэкамендаваныя два літры вады адразу ж з-пад крана з поўным усведамленнем, што яна не толькі смачная, але і карысная. Пагадзіцеся: такі падарунак мінчанам — гэта найлепшы пачатак Года добраўпарадкавання!

Людміла КЛІМОВІЧ, жыхарка сталічнага мікрараёна Сухарава:

— Мы пабудавалі тут кватэру дваццаць гадоў таму, і праблема вады была тады і заставалася дагэтуль самай галоўнай. За гэты час шмат змянілася ў лепшы бок: пабудавана новая дарослая паліклініка, нядаўна ўвялі ў эксплуатацыю вялікую дзіцячую, будуюцца новыя дамы, дзіцячыя садкі, школы, нават царкву пабудавалі... Транспартныя зносіны добрыя, шмат вялікіх крам... Цяпер жа, калі атрымалі з крана чыстую ваду, можна з упэўненасцю казаць, што жыццё ў нас вельмі зручнае і камфортнае!

Тамара ЧЫЧЫЛАВА, жыхарка вуліцы Ляшчынскага:

— Жыву ў мікрараёне Кунцаўшчына з 1990-х гадоў, і атрымаць такі падарунак у маім даволі сталым узросце — а мне ўжо 74-ы год пайшоў — вялікая справа! Людзі пенсіённага ўзросту заўсёды непакояцца за свой стан здароўя, бо якасць вады ўплывае на якасць жыцця і даўгалецце. Я — не выключэнне. Хочацца пажыць як мага даўжэй і стаць відавочцам далейшых станоўчых пераўтварэнняў у нашай прыгожай краіне.

Што датычыцца артэзіянскай вады, якая цяпер цячэ з нашых кранаў, — вельмі ўдзячная кіраўніку дзяржавы за вырашэнне такога важнага для ўсіх нас пытання. Трэба разумець каштоўнасць гэтага падарунка і берагчы тое, што атрымалі. І зараз я кажу не толькі аб прыродных багаццях, але і аб нашай краіне — яе суверэнітэце, незалежнасці і наогул дзяржаўнасці. Трэба берагчы гэтае багацце — жыць на сваёй зямлі пад мірным небам!

Як чалавек, які нарадзіўся ў 1941 годзе, ведаю, аб чым кажу...

Даведка

Наша воднае багацце

Адзін з найкаштоўнейшых рэсурсаў нашай дзяржавы — вада. У свеце яе катастрафічна не хапае. Па даных ЮНЕСКА, цяпер не маюць доступ да чыстай пітной вады 2,2 млрд жыхароў Зямлі, а 3,5 млрд пазбаўлены базавых бяспечных санітарных умоў.

Наша краіна якаснай пітной вадой забяспечана. Згодна з данымі Праграмы развіцця ААН, Беларусь уваходзіць у топ дзяржаў свету па забяспечанасці доступу насельніцтва да чыстай пітной вады, а па забяспечанасці воднымі рэсурсамі ў цэлым — на пятым месцы ў Еўропе, значна апярэджваючы па гэтым паказчыку Польшчу і Украіну.

Дзяржаўным балансам запасаў прэсных падземных вод улічана 1322 водазаборы, радовішчаў (іх частак) з балансавымі запасамі больш за 6 млн м³/сут. Здабыча прэсных падземных вод вядзецца на 990 водазаборах. Запас мінеральных падземных вод уключае 246 водазабораў, радовішчаў (іх частак) мінеральных падземных вод з балансавымі запасамі больш за 62 тыс. м³/сут. Распрацоўваюцца толькі 127 водазабораў.

Штогадовыя аб'ёмы здабычы прэсных падземных вод ад наяўных балансавых запасаў складаюць каля 20 % — выкарыстоўваецца толькі пятая частка разведаных запасаў. Мінеральныя воды ўжываюцца яшчэ менш — каля 3,5 % ад наяўнага багацця. Да таго ж каля 7 % тэрыторыі краіны займаюць неасушаныя балоты, якія не толькі з'яўляюцца лёгкімі Еўропы, але і прыроднымі рэзервуарамі прэснай вады. У іх утрымліваецца каля 8 км³ вады — амаль столькі ж, колькі ва ўсіх азёрах Беларусі разам.

Вядома, да гэтага багацця неабходна адносіцца максімальна беражліва. Так, за апошнія гады на 68 % павялічылася колькасць паверхневых водных аб'ектаў, якім прысвоены добры і вышэйшы экалагічны статус. Рацыянальнаму выкарыстанню садзейнічае ўцягненне сістэм абаротнага і паўторнага водазабеспячэння ў вытворчыя працэсы. Эканомія вады ў выніку ўкаранення такіх сістэм за 2023 год склала 94,5 %. Значна зменшыўся і аб'ём скіду недастаткова вычышчаных сцёкавых вод.

Паводле слоў **намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктара ГАЛАНАВА,** Беларусь актыўна рухаецца па шляху «зялёнага» росту, укаранення тэхналогій, якія забяспечваюць атрыманне дадатковых экалагічных, эканамічных і сацыяльных выгод: скарачэнне выкідаў парніковых газаў, стварэнне новых працоўных месцаў і інавацыйных відаў прадукцыі, максімальнае выкарыстанне адходаў. Нездарма ў 2024 годзе наша дзяржава заняла 30-е месца сярод 166 краін у рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця, паводле Sustainable Development Report 2024. Краіны ў ім ранжыруюцца па агульным бале, якім вымяраецца прагрэс у дасягненні ўсіх 17 МУР. Беларусь набрала 78,6 са 100 магчымых балаў.

«ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК СТАЛІ ЎЖО НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БРЭНДАМ»

Указ кіраўніка дзяржавы аб абвяшчэнні 2025-га Годам добраўпарадкавання актыўна абмяркоўваецца ў рэальнай і віртуальнай прасторах. Галоўны пасыл гэтага ўказа блізкі без перабольшвання кожнаму чалавеку: мы ж хочам жыць у чыстай прыгожай краіне, ганарыцца ёй. Карэспандэнты «Звязды» сабралі меркаванні людзей, ад якіх у многім і залежыць, як будзе рэалізоўвацца ўказ. Зрэшты, добраўпарадкаванне — справа ўсіх і кожнага, а не толькі дзяржавы.

ІНІЦЫЯТЫВЫ ЛЮДЗЕЙ У ДАПАМОГУ

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па экалогіі і прыродакарыстанні Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ лічыць, што ў рэалізацыі ўказа актыўны удзел возьмуць грамадзянскія ініцыятывы:

– Мы ўсе павінны разумець, што трэба не толькі спадзявацца на бюджэт і дзяржаўнае фінансаванне, але і пачынаць з сябе. У першую чаргу, калі мы кажам аб добраўпарадкаванні і якасці нашага жыцця, мы маем на ўвазе камфорт, умовы, якія мы ствараем самі вакол сябе. І, натуральна, пачынаючы з маленькіх крокаў, забяспечваючы добраўпарадкаванне і камфортныя ўмовы пражывання для сябе, мы даём штуршок да развіцця і працы ў гэтым кірунку на сваіх прадпрыемствах, у працоўных калектывах. Апошнім часам вялікі ўпор робіцца на развіццё валанцёрскіх і грамадзянскіх ініцыятыў, калі людзі самі ініцыіруюць пэўныя праекты. Добраўпарадкаванне і навядзенне парадку вакол сваёй тэрыторыі, домаўладання і з'яўляецца такой ініцыятывай. Таму, упэўнена, Год добраўпарадкавання падштурхне развіццё грамадзянскіх ініцыятыў, да навядзення парадку вакол сябе.

ВОПЫТ ПА ДОБРА-ЎПАРАДКАВАННІ НАЗАПАШАНЫ БАГАТЫ

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА падкрэсліў: дакумент носіць комплексны, усёабдымны характар і ўлічвае абсалютна ўсе кірункі: ад азеляненне тэрыторый, асвятлення вуліц, рамонту вулічна-дарожнай сеткі, уладкавання прыпыначных пунктаў да падтрымання парадку ў лесе, уключэння ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў, што не выкарыстоўваюцца, і санітарнай ачысткі паверхневых водных аб'ектаў.

– Пры гэтым вельмі важна, што ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прадугледжвае рэалізацыю мерапрыемстваў і па іншых, не ўключаных у пералік аб'ектах, аб якіх найлепш ведаюць людзі і ўлады на месцах. Таму справа будзе адказная, – акцэнтаваў увагу парламентарый. – Нам усім неабходна мабілізавацца і, як кажуць беларусы, талакой, дружна ўзяўшыся за працу, зрабіць навакольны свет больш чыстым і прыгожым – для сябе, для нашых дзяцей і ўнукаў.

Дэпутат канстатаваў: чысціня і парадак сталі ўжо нашым нацыянальным брэндам:

> **Звярніце ўвагу, колькі карыснага для добра-ўпарадкавання краіны зрабілі нашы людзі ў папярэднія гады! Успомнім хаця б штогадовыя суботнікі, у якіх**

«МЫ ЎСЕ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ СВОЙ УНЁСАК»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА гаварыў аб указе на пачатку пасяджэння Палаты, акцэнтаваўшы на гэтым увагу дэпутацкага корпуса:

– Мы ўступілі ў новы заканадаўчы год, у якім трэба будзе вырашаць шмат найважнейшых дзяржаўных задач. Кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ нумар адзін, у адпаведнасці з якім гэты год аб'яўлены Годам добраўпарадкавання ў нашай краіне. Задача дэпутатаў – не толькі самім актыўна ўдзельнічаць у навядзенні парадку на месцах, але і ўцягнуць грамадзян у гэты працэс.

> **Мы ўсе павінны зрабіць свой унёсак ва ўладкаванне**

інфраструктуры населеных пунктаў (і гарадоў, і сельскіх населеных пунктаў), стварэнне камфортнага асяроддзя, развіццё пасёлкаў, вёсак, аграгарадкоў, азеляненне сквераў і двароў, паляпшэнне знешняга выгляду тэрыторый, добраўпарадкаванне вакол чыгуначных і аўтамабільных трас».

Урадам будзе зацверджаны рэспубліканскі план правядзення мерапрыемстваў па тэматыцы года. Дэпутаты ўнясуць свае прапановы па мерапрыемствах, у якіх возьмуць удзел.

удзельнічалі, не пабаюся сказаць, абсалютна ўсе — ад малога да вялікага: ад кіраўніка беларускай дзяржавы, членаў урада, парламентарыяў, дэпутатаў мясцовых Саветаў да школьнікаў і студэнтаў. Усе разам наводзілі парадак на зямлі, у гарадах і сельскіх населеных пунктах, аднаўлялі лясны фонд, ачышчалі ад дзікай саматужнай расліннасці старыя паркі і скверы, стваралі рэкрэацыйныя зоны, добраўпарадкоўвалі воінскія пахаванні, рэалізоўвалі грамадзянскія ініцыятывы па будаўніцтве спартыўных і дзіцячых гульнявых пляцовак на прыдамавых тэрыторыях. Усяго не пералічыш».

Алег Дзячэнка падсумоўвае: таму зачын мы маем салідны. Ён таксама адзначае, што ў прэзідэнцкім указе атрымалі адлюстраванне ў тым ліку і прапановы, якія паступілі ад грамадзян, дзе тыя падказваюць, на якія аб'екты варта звярнуць павышаную ўвагу або дзе неабходна сумеснымі намаганнямі акультурыць навакольнае асяроддзе.

— З маёй Асіповіцкай выбарчай акругі № 89 ад неабыякавых людзей, якія хварэюць у прамым сэнсе слова за лёс сваёй малой радзімы, такія прапановы паступаюць рэгулярна, — прыводзіць прыклад дэпутат. — Яны датычацца, у прыватнасці, пытанняў распаўсюджвання сумніку ў нашых лясах, а таксама вядомага заразнага паразіта — амялы белай. Хвалюе людзей і праблема зносу старых жылых і гаспадарчых будынкаў у вёсках, утылізацыі старых яблыневых садоў. Вопыт па добраўпарадкаванні нашай краіны назапашаны багаты. Праблемы вызначаны, задачы пастаўлены. За працу!

ДЭПУТАТЫ ДАПАМОГУЦЬ!

«У Гомельскай вобласці добраўпарадкаванне тэрыторый знаходзіцца на пастаянным кантролі органаў кіравання і самакіравання ўсіх узроўняў, бо парадак на зямлі — пастаянная і штодзённая праца, — звяртае ўвагу **член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** — Адзін з фактараў яе паспяховасці — заахвочванне мясцовых жыхароў. У 2023 годзе на Гомельшчыне прайшоў першы конкурсны адбор ідэй і ініцыятыў грамадзян з улікам акрэсленага на заканадаўчым узроўні механізма рэалізацыі праектаў грамадзянскіх ініцыятыў. Вопыт паказаў, што жыхары вобласці прапануюць цікавыя ідэі для развіцця тэрыторый сваіх населеных пунктаў. У мінулым годзе Гомельскі абласны Савет дэпутатаў накіраваў у абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў 111 заявак на ўдзел у конкурсным адборы грамадзянскіх ініцыятыў. Пераможцамі было прызнана 25 праектаў рознай тэматыкі з усіх раёнаў вобласці. Цяпер праходзіць новы конкурсны адбор. Ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыцця людзей, добраўпарадкаванне населеных пунктаў і ўвогуле развіццё патэнцыялу той ці іншай тэрыторыі актыўна падтрымлівае дэпутацкі корпус Гомельшчыны.

У кожным горадзе, раёне, сельсавеце, вёсцы ёсць актывісты, неабыякавыя жыхары, якія імкнуцца праяўляць ініцыятыву, дапамагаць органам мясцовай улады ў вырашэнні хвалюючых пытанняў. А менавіта дэпутаты на сваіх тэрыторыях вызначаюць такіх актыўных людзей, дапамагаюць праявіцца ў ажыццяўленні карыснай справы. Бо вельмі важна аб'ядноўваць намаганні дзяржавы і грамадства па далейшым паляпшэнні якасці жыцця ў нашай краіне».

НА КАРЫСЦЬ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Старшыня Слаўгарадскага раённага выканаўчага камітэта Андрэй КАЖАМЯКІН лічыць, што акцэнт на добраўпарадкаванні дапаможа істотна палепшыць стан сельскіх тэрыторый і прыцягнуць цікавасць да размешчаных на іх славутасцяў. У Слаўгарадскім раёне гэта ўнікальны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Блакітная крыніца», які вядомы далёка за межамі Беларусі і з'яўляецца аб'ектам турызму і паломніцтва.

— Гэты аб'ект адзін з самых значных на тэрыторыі раёна, — кажа Андрэй Кажамякін. — Больш чым чатыры гады таму дзякуючы Прэзідэнту краіны ў нас быў пабудаваны вельмі важны для эканомікі раёна мост праз раку Сож. Слаўгарадскі раён з'яўляецца адным з тых, на які распаўсюджваецца дзеянне дзяржпраграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Стану гэтых зямель Аляксандр Лукашэнка заўсёды аддае вялікую ўвагу. Наш раён моцна пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС, але тэрыторыі адраджаюцца. Дзякуючы спецыяльнай праграме сюды прыходзяць інвестыцыі і едуць людзі. Пуцеправод звязаў два берагі ракі, вырашыў праблему, якая існавала доўгі час. У зімовы перыяд трапіць у Засожжа было праблематычна, прыходзілася абслугоўваць населеныя пункты, якія там знаходзяцца, у аб'езд. А гэта звыш 100 лішніх кіламетраў. Наведваць і даглядаць «Блакітную крыніцу» наогул было амаль немагчыма. Цяпер усё гэта ў мінулым. Мост не толькі вырашыў праблему, але і даў магчымасць актыўна развіваць турызм, скарацію адлегласць паміж раёнам і расійскім прымежжам. Сёлета мы плануем правесці яшчэ больш маштабную работу для развіцця інфраструктуры і стварэння больш камфортных умоў для знаходжання паломнікаў і турыстаў на нашым помніку прыроды рэспубліканскага значэння «Блакітная крыніца».

Фота БелТА.

МАДЭЛІ БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ

Пачатак 2025 года для беларусаў — не проста чарговы гадавы перыяд. 2025-ы — гэта старт-год — год выбараў — старт новага пяцігадовага перыяду станаўлення і развіцця беларускай дзяржавы і грамадства да 2030 года.

Свет у цяперашні час зведвае кардынальныя структурныя змяненні. У гэтых умовах мы назіраем татальнае разбурэнне ранейшых устояў у палітыцы, эканоміцы і грамадстве. Найбольшаму ціску падвяргаюцца дзяржавы — тыя суверэнныя краіны, якія арыентаваны на самастойнае развіццё без якога-небудзь знешняга кіравання і неакаланіялізму.

Пры разбурэнні суверэнных краін адной з ключавых мэт атакі заходнімі ідэолагамі выбраны «чалавек дзяржавы» і ў першую чаргу моладзь. «Чалавек дзяржавы» — гэта грамадзянін, які вырас і прайшоў станаўленне ў дзяржаве, у парадку, у прававой сістэме, а не вырас ва ўмовах хаосу, каланіяльнага бяспраўя і новага «цёмнага перыяду сярэднявечнага гвалту» *(яркія прыклады — Югаславія, Сірыя, Лівія, Украіна)*.

Захад выдатна ўсведамляе, што, разбурыўшы мадэлі свядомасці ў моладзі *(самаідэнтыфікацыі: хто мы, хто для нас вораг, а хто сябар, дзе нашы карані і за што мы ваюем)*, можна пазбавіць любое грамадства і дзяржаву будучыні. Моладзь не будзе змагацца за каштоўнасці ранейшых пакаленняў, а прыме чужыя, навязаныя хлуслівыя новыя каштоўнасці і сімвалы *(яркі прыклад ва Украіне: Бандэра, Шухевіч — героі, а ветэраны і партызаны ВАВ — бандыты)*.

У сувязі з гэтым **нашага Прэзідэнта вельмі хвалюе тэма, як будзе «заўтра» жыць краіна, якое пакаленне вырасце (і тут не толькі аб пакаленні ўпраўленцаў або маладых палітыкаў, шырэй — беларуская моладзь). Ім трэба будзе захоўваць традыцыі, каштоўнасці, гісторыю — захоўваць нашы карані!**

Прэзідэнт дакладна разумее, што важна цяпер, у 2025 годзе, вызначыць мадэлі будучыні нашай краіны і грамадства — вызначыць, куды мы развіваемся як ва ўнутраных рамках нашай краіны, так і на знешнім контуры ва ўзаемадзеянні з іншымі дзяржавамі і аб'яднаннямі. Стварыўшы такую мадэль будучыні, мы будзем разумець, куды мы ідзём, якія ў нас мэты і за што ваюем!

2025 год — год добраўпарадкавання! Важна павысіць узровень і якасць побыту ва ўсіх рэгіёнах і кутках нашай краіны. Як вядома, быццё вызначае свядомасць. Будуць якасныя дарогі, дамы, школы, спартыўныя комплексы, кінатэатры, тэатры, музеі, дамы культуры, аўтамабільны, аўтобусны і чыгуначны транспарт, даступнасць, хуткасць і лёгкасць перамяшчэння, гандлёвая сетка, напоўненасць і даступнасць прадуктамі і многае іншае... тады і будзе стан дабрабыту ў свядомасці.

Мы бачылі, як напярэдадні 2020 года нас, беларусаў, разгойдвалі на тэме адсутнасці рашэння лакальных бытавых праблем: плот не адрамантавалі мясцовыя ўлады, дзіркі не заладзілі ў вёсцы і... уся краіна «падключалася» праз дэструктыўныя каналы інфармацыі да абмеркавання гэтых фактаў і пачынала верыць, што там... маўляў, на Захадзе, лепш... там такога няма, і дарогі... і платы.

Цяпер гэтыя тэхналогіі псіхалагічнага разгойдвання грамадства мы ведаем, і ведаем, як з імі змагацца ў інфармацыйнай сферы.

Разам з тым 2025 год добраўпарадкавання — гэта не для Захаду і барацьбы з ім, гэта для нас з ВАМІ! Мы гаспадары на сваёй вольнай і свабоднай зямлі. Мы самі зацікаўлены ў тым, каб зрабіць наша жыццё лепш, і не проста лепш у сталіцы і абласных цэнтрах, а зрабіць лепш у любым кутку нашай краіны. І тут стаіць задача не толькі для дзяржавы і службовых асоб, але і для кожнага грамадзяніна — мы не чужыя адзін аднаму, мы адзіныя: калі ты ў дастатку, дапамажы блізкаму, дапамажы незнаёмым бабулі, дзядулю (старэйшаму пакаленню) у вёсках, хто будаваў нашу Беларусь у мінулыя гады.

Адначасова наш Прэзідэнт дакладна разумее, што наша краіна не ў ізаляцыі, мы не асобны востраў у неабсяжным акіяне, мы не самі па сабе.

Трэба ў наступныя пяць гадоў актыўна пашыраць міжнароднае супрацоўніцтва і павышаць статус і пазіцыі Беларусі на геапалітычнай карце свету. Ніхто за нас гэтага не зробіць!

Тыя краіны, якія паверылі ў НАТА, у ЕС, фактычна страцілі права выбару і суверэннага развіцця, ператварыўшыся ў лімітрофныя ўтварэнні *(тэрыторыі, якія маюць права толькі на ўтрыманне войскаў НАТА і забеспячэнне рэсурсамі метраполіі, на сённяшні дзень — Вашынгтон, Лондан, Брусель)*.

Наш Прэзідэнт не раз вызначаў, што для паўнапраўнага развіцця на міжнароднай арэне (так, каб з намі лічыліся, а не дамінавалі) необходна асноўную ўвагу ўдзяліць эканоміцы. Моцная эканоміка, наяўнасць высокага ўзроўню ўласнай капіталізацыі дае магчымасць выбудоўваць незалежную знешнюю і ўнутраную палітыку.

У тэме эканомікі ключавое — распрацоўваць і ствараць навукаёмістыя тавары з высокай прыбавачнай вартасцю і актыўна замяшчаць імі імпарт і адначасова нарошчваць інтэнсіўна экспарт. Так мы зможам у адзінку часу зарабляць больш, а значыць, унутраны валавы прадукт і даход на душу насельніцтва будзе вышэй.

Лібералы ў 1990-я актыўна спрабавалі насадзіць ідэалогію адмовы ад уласнай вытворчасці і сельскай гаспадаркі — маўляў, не трэба вам сваё, будзеце купляць усё ў нас. Аднак, **толькі дзякуючы празорлівасці Аляксандра Лукашэнкі, беларусы не знішчылі свае вытворчасці і пастаянна развівалі іх. Цяпер, на сканчэнні больш як 30 гадоў, мы маем наймацнейшы вытворчы, аграрны і навукова-тэхналагічны базіс, які вядзе нас наперад!**

На найбліжэйшыя пяць гадоў наша задача даць жыццё новым вытворчасцям і сектарам эканомікі, уцягнуць па максімуме наша насельніцтва ў гаспадарчыя працэсы з высокай прыбавачнай вартасцю.

Як бачым, будучыню вызначаем мы самі, калі свабодныя і незалежныя. У іншым выпадку — будучыню вызначаюць за нас! **Наш Прэзідэнт — гэта стрыжань светлай будучыні беларусаў, росту іх дабрабыту і дастатку.**

Аляксей АЎДОНІН, аналітык БІСД.

«Выбары мы праводзім для сваёй краіны і для свайго народа»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па словах кіраўніка ЦВК, сігналаў аб пазаштатных сітуацыях не паступала. Ён паведаміў, што ёсць інфармацыя аб псаванні інфармацыйных плакатаў аб кандыдатах. Ацэнку такой дзейнасці, як звярнуў увагу Ігар Карпенка, дадуць праваахоўныя органы. Дэструктыўная работа назіраецца ў сацыяльных сетках з-за мяжы, вядуцца заклікі галасаваць супраць усіх або байкатаваць выбары, гучаць заявы аб непрызнанні выбараў. «Заклікі, якія прымушаюць да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, прызначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, з'яўляюцца адміністрацыйным правапарушэннем», — звярнуў увагу старшыня Цэнтрвыбаркама.

«Выбары мы праводзім для сваёй краіны і для свайго народа, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Яўка выбаршчыкаў на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі традыцыйна высокая. Назіраецца цікавасць грамадзян да электаральнай кампаніі».

Дзеля абароны членаў участковых камісій

З 1 студзеня пачаўся агітацыйны перыяд, які завершыцца 25 студзеня. «У выканкамы паступаюць апавяшчэнні ад кандыдатаў і іх даверaных асоб аб правядзенні масавых мерапрыемстваў, тэрытарыяльныя камісіі прымаюць заявы аб правядзенні сустрэч у спецыяльна адведзеных памяшканнях, — расказаў кіраўнік ЦВК. — Падрабязная інфармацыя аб месцах правядзення сустрэч размяшчаецца на сайтах выканкамаў».

Азнаёміцца з перадвыбарнымі праграмамі кандыдатаў у Прэзідэнты можна будзе ў друку, эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё (15 і 17 студзеня з 8.00 да 9.00), тэлеканала «Беларусь 1» (16 студзеня з 18.00 да 20.00). Як адзначыў Ігар Карпенка, скаргі аб парушэнні кандыдатамі і іх даверанымі асобамі заканадаўства ў ЦВК не паступалі.

Створана 5325 участкаў для галасавання — адпаведна, такая ж колькасць участковых камісій. У інтэрнэце абмяркоўваецца пытанне неапублікавання ў адкрытым доступе персанальных звестак членаў участковых камісій. «Але гэта не значыць, што мы іх хаваем ад выбаршчыкаў, — удакладніў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. — Калі выбаршчык прыйдзе на ўчастак для галасавання, то ўбачыць членаў камісій, якія будуць насіць бэйджы з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку. Гэта заканадаўчая мера прадухіляе несанкцыянаванае выкарыстанне персанальных даных членаў выбарчых камісій».

Участкаў за мяжой не будзе

Інфармацыя аб размяшчэнні участкаў для галасавання з указаннем іх меж, а таксама месцазнаходжанняў участковых камісій размешчана на сайтах адпаведных выканаўчых камітэтаў, у раздзеле «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 года» на сайце ЦВК. Акрамя таго, на сайце Цэнтральнай камісіі працуе сэрвіс па пошуку участкаў для галасавання, дзе можна зручным і хуткім спосабам знайсці свой участак для галасавання, інфармацыю аб участковай камісіі (адрас, тэлефон).

Да 15 студзеня кожны выбаршчык павінен атрымаць запрашэнне на выбары, у якім будуць указаны адрас участка для галасавання і нумар тэлефона, а таксама ўлётку з біяграфічнымі данымі кандыдатаў. Звесткі аб кандыдатах таксама размешчаны на сайце ЦВК.

Фота БелТА.

Участкі для галасавання за мяжой не ствараюцца. Гэта, па словах Ігара Карпенкі, абумоўлена адсутнасцю мер бяспекі на ўчастках, якія раней утвараліся на тэрыторыі іншых дзяржаў, скарачэннем колькасці работнікаў дыпкорпуса. Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь — не адзіная краіна, якая мае такі досвед.

Разам з тым створаны ўмовы для арганізацыі галасавання грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой і стаяць на консульскім уліку. Прагаласаваць такія грамадзяне змогуць на адным з шасці участкаў, якія будуць размешчаны ў Мінску і ў пяці абласных цэнтрах краіны. Адрасы гэтых участкаў размешчаны на сайце Цэнтрвыбаркама. Ігар Карпенка выказаў спадзяванне, што суседнія краіны не будуць ствараць перашкод для перасячэння нашымі грамадзянамі граніцы з мэтай рэалізацыі выбарчага права.

Уключэнне ў спісы — да выбараў

Пачынаючы з 10 студзеня кожны выбаршчык мае права звярнуцца ва ўчастковую камісію для праверкі звестак аб сабе ў спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах. У будняя дні ўчастковыя камісіі працуюць з 17.00 да 19.00, па суботах — з 12.00 да 14.00.

«У спісы ўключаюцца грамадзяне Беларусі, якія валодаюць выбарчым правам, зарэгістраваныя па месцы жыхарства, — удакладніў старшыня ЦВК. — Пры наяўнасці ў грамадзяніна рэгістрацыі і па месцазнаходжанні ён уключаецца ў спіс на ўчастку толькі па месцазнаходжанні. Грамадзяне, у якіх адсутнічае рэгістрацыя на тэрыторыі гэтага ўчастка для галасавання, могуць быць дадаткова ўключаны ў спіс на падставе пашпарта (ідэнтыфікацыйнай карты) грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і дакумента, які пацвярджае пражыванне на тэрыторыі ўчастка для галасавання, пры ўмове, што грамадзянін яшчэ не прагаласаваў на ўчастку для галасавання па месцы жыхарства (месцы знаходжання)».

Пры гэтым звярнуцца ва ўчастковую камісію для ўключэння ў спіс выбаршчыкаў па месцы жыхарства можна толькі да дня выбараў. Да дакументаў, якія пацвярджаюць пражыванне на адпаведнай тэрыторыі, могуць быць аднесены дагавор найму (зарэгістраваны раённым, гарадскім, пасялковым, сельскім выканаўчым камітэтам, мясцовай адміністрацыяй раёна ў горадзе), пасведчанне аб праве ўласнасці ў адносінах да нерухомай маёмасці, камандзіровачнае пасведчанне.

Галасаванне дома — па заяўках

На цяперашні момант пры Цэнтральнай камісіі акрэдытаваны 7 нацыянальных назіральнікаў, пры тэрытарыяльных камісіях — 962 назіральнікі, пры ўчастковых — 27 361. Акрамя таго, працягваецца акрэдытацыя замежных (міжнародных) назіральнікаў. Ужо акрэдытаваны 362 такія назіральнікі. Сярод іх — прадстаўнікі ад СНД, МПА СНД, ШАС, ПА АДКБ, Сакратарыята Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі, Маладзёжнай арганізацыі Руху недалучэння, выбарчых органаў замежных дзяржаў, а таксама незалежныя наглядальнікі і эксперты. Прадстаўніцтва краін ужо складае каля 40, з іх — каля 15 еўрапейскіх краін. За прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі таксама будуць назіраць прадстаўнікі краін афрыканскага кантынента, Лацінскай Амерыкі, Азіі, прасторы СНД.

Датэрміновае галасаванне пройдзе за пяць дзён да выбараў — з 21 да 25 студзеня 2025 года ўключна.

Датэрмінова маюць права прагаласаваць выбаршчыкі, якія не змогуць прыйсці на ўчастак 26 студзеня. У перыяд датэрміновага галасавання ўчастковыя камісіі працуюць з 12.00 да 19.00 гадзін без перапынку. У асноўны дзень галасавання, 26 студзеня, галасаванне будзе праходзіць з 8.00 да 20.00 гадзін.

У дзень выбараў магчымае галасаванне дома па заявах выбаршчыкаў. «Калі выбаршчык па стане здароўя або па іншых уважлівых прычынах не зможа ў дзень выбараў прыйсці ў памяшканне для галасавання, ён мае права пісьмова або вусна звярнуцца ў адпаведную ўчастковую камісію з просьбай арганізаваць галасаванне па месцы яго знаходжання, — патлумачыў Ігар Карпенка. — Выбаршчык можа перадаць такую просьбу ва ўчастковую камісію пры садзейнічанні іншых асоб: напрыклад, сваякоў, суседзяў. Афіцыйнага пацвярджэння прычын немагчымасці прыйсці ў памяшканне для галасавання не патрабуецца». З такой просьбай выбаршчык можа звярнуцца да 18.00 26 студзеня.

Бюлетэнь выдаецца выбаршчыку, уключанаму ў спіс, пры прад'яўленні пашпарта (ідэнтыфікацыйнай карты) грамадзяніна Рэспублікі Беларусь; ваеннага білета (для ваеннаслужачых тэрміновай службы); службовага пасведчання работніка дзяржаўнага органа (арганізацыі); пасведчання кіроўцы; пенсіённага пасведчання, пасведчання інваліда (пры наяўнасці ў ім фатаграфіі); студэнцкага білета; білета навучэнца; даведкі органа ўнутраных спраў, якая пацвярджае асобу грамадзяніна (у выпадку страты (крадзяжу) пашпарта (ідэнтыфікацыйнай карты) грамадзяніна Рэспублікі Беларусь).

Каментуючы спробы ўмяшання ў выбарчы працэс, старшыня Цэнтрвыбаркама нагадаў, што выбарчым працэсам павінны займацца тыя суб'екты, якія вызначаны заканадаўча. «У кожнага суб'екта ёсць выключная функцыя, — падкрэсліў ён. — Не павінны іншыя суб'екты ўмешвацца ў тыя пытанні, якія не адносяцца да іх кампетэнцыі». У сваю чаргу, Цэнтрвыбаркам разам з іншымі суб'ектамі выбарчага працэсу, як запэўніў Ігар Карпенка, зробіць усё дзеля таго, каб забяспечыць электаральны суверэнітэт нашай краіны і правесці гэтую выбарчую кампанію ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам.

Вераніка КАНЮТА.

Дарэчы

Адзін з удзельнікаў прэс-канферэнцыі прадэманстраваў кіраўніку Цэнтрвыбаркама ўлётку, выкладзеную прадстаўнікамі апазіцыі за мяжой, з заклікам галасаваць супраць усіх або байкатаваць выбары. Журналісты пацікавіліся асабістымі адносінамі Ігара Карпенкі да такой «прадукцыі». Замест адказу на гэта пытанне старшыня ЦВК папрасіў прынесці шрэдар (устройства для драблення паперы) і на вачах у прысутных знішчыў паказаныя яму ўлёткі. «Заклікаем нашых грамадзян прыходзіць на выбарчыя ўчасткі і рабіць свой усвядомлены выбар! — заявіў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. — Як кажуць, сабакі брэшуць, а караван ідзе».

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

НА КАРЫСЦЬ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА Ў ЦЭЛЫМ

Індывідуальны падыход да пакарання, падрыхтоўка аграрыяў і бонусы крэдытаатрымальнікам

Фота БелТА.

Падчас першага ў новым годзе пасяджэння другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання дэпутаты прынялі шэраг важных заканадаўчых рашэнняў, якія накіраваны на паляпшэнне кадравай сітуацыі ў сельскагаспадарчай сферы, даступнасць спажывецкага крэдытавання і спрашчэнне банкаўскіх працэдур, удасканаленне крымінальнага заканадаўства. Прынятыя законапраекты міжнароднага характару сведчаць аб шматвектарнасці знешняй палітыкі Беларусі, нашай адкрытасці да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

БОЛЬШ МЯККІЯ ВІДЫ ПАКАРАННЯ

Праект закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці», унесены ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам Беларусі, атрымаў шырокае грамадскае абмеркаванне. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы праведзена маштабная работа ва ўсіх рэгіёнах краіны. Змяненні, абумоўленыя індывідуальным падыходам да крымінальнай адказнасці, падтрыманы як зацікаўленымі органамі, так і простымі грамадзянамі.

Гуманны падыход — да асоб, якія ўпершыню здзейснілі злачынства. У прыватнасці, пазбаўленне волі не будзе прызначацца жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзяцей-інвалідаў, а таксама інвалідам I групы. Пры гэтым злачынства не павінна ўяўляць вялікай грамадскай небяспекі. У шэрагу выпадкаў гэта правіла прымяняцца не будзе. Напрыклад, пры здзяйсненні злачынстваў, якія пацягнулі па неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання. Датычыцца гэта і тых, хто здзейсніў злачынства экстрэмісцкай накіраванасці. Аналагічныя нормы замацаваны ў адносінах да асоб, якія ўпершыню парушылі крымінальнае заканадаўства ва ўзросце да 18 гадоў.

Як патлумачыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Андрэй ЛІС**, мяняюцца санкцыі ў 97 саставах злачынстваў. Яны дапаўняюцца больш мяккімі і прамежкавымі па цяжкасці відамі пакарання. «Дагэтуль 24 саставы злачынстваў прадугледжвалі ў якасці пакарання толькі пазбаўленне волі без усялякай альтэрнатывы, — удакладніў ён. — Гэта не дае магчымасці судам больш гнутка падыходзіць да прызначэння пакарання з улікам і асобы вінаватага, і ступені грамадскай небяспекі дзеяння. Мне самому ў перыяд працы ў следчых органах нярэдка даводзілася сутыкацца з сітуацыямі, калі і асоба вінаватага, і асаблівыя абставіны здзяйснення злачынства ўказвалі на тое, што пазбаўленне волі з'яўляецца занадта суровым пакараннем за ўчыненае, аднак гэтага патрабаваў закон. Цяпер гэты дысбаланс будзе ліквідаваны».

Новаўвядзенні закрануць і крымінальную адказнасць за нарказлачынствы. Замацоўваюцца альтэрнатыўныя, больш мяккія, пакаранні ў выглядзе арышту (за набыццё або захоўванне наркотыкаў) і абмежаванні волі (за разавыя выпадкі збыту наркотыкаў). Ніжняя мяжа пакарання за збыт наркотыкаў у складзе арганізаванай групы зніжаецца з 10 да 8 гадоў пазбаўлення волі.

Па словах Андрэя Ліса, гэтыя навелы сталі аднымі з самых дыскусійных, але ў цэлым былі падтрыманы. «Пад дзеянне гэтага артыкула трапляюць не толькі закаранелыя злачынцы, але і маладыя людзі, якія не да канца разумеюць, што яны здзяйсняюць, — заўважыў дэпутат. — Таму пашырэнне магчымасці дыферэнцыравана падыходзіць да прызначэння пакарання за такія злачынствы апраўдана». Пры гэтым, як падкрэсліў парламентарый, верхняя мяжа пакарання за нарказлачынства не змяняецца: яна застаецца ранейшай — да 20 гадоў пазбаўлення волі.

Захоўваецца крымінальная адказнасць для грамадзян, якія распаўсюджваюць рэквізіты чужых банкаўскіх картак. Уводзіцца адміністрацыйная адказнасць для асоб, якія прадстаўляюць рэквізіты ўласных банкаўскіх картак. Шэраг злачынстваў пераводзіцца ў справы прыватна-публічнага абвінавачвання. Гэта датычыцца злачынстваў, звязаных з парушэннем Правілаў дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў, што па неасцярожнасці прывяло да цялесных пашкоджанняў. Злачынствы, здзейсненыя блізкімі асобы, якая пацярпела, таксама будуць адносіцца да спраў прыватна-публічнага абвінавачвання. Пашыраны пералік злачынстваў, за якія грамадзяне Беларусі будуць несці адказнасць пры іх здзяйсненні за межамі нашай краіны. У прыватнасці, гэта датычыцца злачынстваў тэрарыстычнай накіраванасці.

З УЛІКАМ ЦЯЖКАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ СІТУАЦЫІ

У другім чытанні прыняты законапраект «Аб спажывецкім крэдыце і спажывецкай мікрапазыцы». Як падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Аляксей РАЙКО**, гэта інавацыйны дакумент для нашай краіны. «Законапраект выраўноўвае адносіны паміж мікрафінансавымі арганізацыямі і банкамі, — паведаміў ён. — Інфармаванне заяўніка аб перавышэнні памеру ўстаноўленых паказчыкаў пазыковай нагрузкі (забяспечанасці крэдыту) будзе ажыццяўляцца да заключэння дагавора спажывецкага крэдыту або спажывецкай мікрапазыкі і пасля для прыняцця заяўнікам узважанага рашэння. Нашы грамадзяне фактычна будуць праінфармаваныя на ўсіх стадыях: да моманту заключэння фінансавай здзелкі, у працэсе выканання сваіх абавязацельстваў і пасля выканання сваіх фінансавых абавязацельстваў.

Уводзіцца паняцце цяжкай жыццёвай сітуацыі. Да такіх будуць адносіцца страта працы, смерць мужа ці жонкі крэдытаатрымальніка, часовая непрацаздольнасць звыш 40 дзён, а таксама прызнанне інваліднасці ў адпаведнасці з заканадаўствам».

Грамадзяне змогуць звярнуцца ў банк або мікрафінансавую арганізацыю для таго, каб прадоўжыць тэрмін, атрымаць адтэрміноўку па выплаце сваіх абавязацельстваў. Аднак, як звярнуў увагу дэпутат, гэта не здымае абавязкі нашых грамадзян па выкананні сваіх абавязацельстваў. Адтэрміноўка прадастаўляецца не менш як на тры месяцы.

* * *

Таксама ў першым чытанні дэпутаты адобрылі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху». Цяпер атрымаць права кіравання самаходнай машынай сельскагаспадарчага прызначэння (катэгорыя «F») можна будзе не з 18 гадоў, як гэта было раней, а з 17 гадоў.

Вераніка КАНЮТА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю намесніка дырэктара дзяржаўнай установы «Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» Артура Гарыевіча ЗЕЛЬСКАГА і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

КАНТЭКСТ

СУД ПАД САНКЦЫЯМІ

У што ператварылася брусельскае «правасуддзе»

Адна з красамоўных навін з-за акіяна — ніжняя палата кангрэса ЗША адобрыла законапраект аб санкцыях супраць Міжнароднага крымінальнага суда (МКС) у Гаазе.

Законапраект быў прыняты 243 галасамі супраць 140. Пры гэтым разам з рэспубліканцамі за яго галасавалі і 45 дэмакратаў. Устрымаўся адзін член рэспубліканскай партыі Томас Мэсі. Ён удакладніў, што таксама супраць умяшання МКС у справы суверэнных дзяржаў, але не лічыць гэтую тэму актуальнай для аднаго з першых пасяджэнняў новага складу кангрэса. Пра гэта паведаміла CNN.

У законапраекце прапанавана «асудзіць самым рашучым чынам» ордэры на арышт прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху і экс-міністра абароны Ёава Галанта, якія Міжнародны крымінальны суд выдаў летась у лістападзе за іх «злачынствы супраць чалавечнасці і ваенныя злачынствы». Цяпер ЗША паказалі МКС яго сапраўднае месца ў глабальнай «сістэме каардынат» — рэстрыкцыі супраць пракурораў і суддзяў будуць уводзіцца за любыя спробы «расследаваць, арыштоўваць, затрымліваць ці праследаваць асоб, якія знаходзяцца пад абаронай Злучаных Штатаў і іх саюзнікаў». Пад саюзнікамі маюцца на ўвазе 32 члены НАТА і 19 краін, якія не ўваходзяць у альянс, уключаючы Ізраіль, удакладняе Fox News. Санкцыі маюць на ўвазе забарону на здзелкі з уласнасцю ў Штатах, а таксама забарону на ўезд у краіну з ануляваннем раней выдадзеных віз. У законапраекце адзначаецца, што ні ЗША, ні Ізраіль не падпісвалі Рымскі статут, які заснаваў МКС, і, адпаведна, не знаходзяцца пад яго юрысдыкцыяй.

У чэрвені мінулага года ніжняя палата амерыканскага парламента ўжо адобрыла законапраект аб санкцыях супраць Міжнароднага крымінальнага суда. Але тады дакумент не прынялі ў сенаце. Цяпер верхнюю палату таксама кантралююць рэспубліканцы. Лідар сенацкай большасці Джон Цьюн абяцаў забяспечыць найхутчэйшае праходжанне законапраекта, каб выбраны прэзідэнт ЗША Дональд Трамп «мог падпісаць яго неўзабаве пасля ўступлення на пасаду».

Рашэнне аб накладанні санкцый на суд «з'яўляецца неабходным адказам на яго абуральныя і неабгрунтаваныя прэтэнзіі», адзначаецца ў заяве спікера ніжняй палаты Майка Джонсана. «Галасаванне падводзіць рысу пад беззаконнымі дзеяннямі службовых асоб МКС. ЗША цвёрда стаяць на баку Ізраіля і не дазволяць міжнародным бюракратам беспадстаўна выдаваць ордэры на арышт ізраільскага кіраўніцтва».

Як адзначаюць эксперты, санкцыйная палітыка Злучаных Штатаў можа стаць прычынай новага маштабнага дыпламатычнага крызісу. У чарговы раз стала відавочна, што ордэры брусельскай канторы з гучнай назвай не вартыя нават кошту той паперы, на якой яны выпісаны, адзначыла vz.ru. Гэта фактычна прызнаў і сам суд, выказаўшы заклапочанасць з нагоды росту колькасці прадпісанняў, якія застаюцца нявыкананымі. У чарговы раз стала відавочна, што гэта кантора, якая поўным ходам прымяняе падвоеныя стандарты і выкарыстоўваецца як інструмент палітычных гульняў (узгадаем той жа ордэр на арышт Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна), а пасля за непатрэбнасцю паказальна «санкцыянуецца».

«Тое, што МКС — гэта бескарысная арганізацыя, Беларусь усвядоміла дзесяцігоддзі таму, адмовіўшыся падпісваць Рымскі статут. Час паказаў, што мы мелі рацыю, **а гэты «высокі суд» проста чарговы бюракратычны арганізм, які дзейнічае ў інтарэсах гаспадароў «свету, заснаванага на правілах». Ён нічога не вырашае, не здольны абараніць праўду, а спрабуе дыктаваць «уласную волю» суверэнным дзяржавам і іх кіраўнікам,** — адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, доктар ваенных навук, прафесар Мікалай Бузін. — Жыць сваім розумам, трымаць слова і захоўваць мір, працаваць на карысць сваёй краіны і яе грамадзян — у гэтым сутнасць нашай палітыкі, якая рэалізоўваецца Прэзідэнтам. Сёння нас чуе і падтрымлівае ўсё большая колькасць краін і народаў, якія хочуць справядлівасці, шануюць уласны суверэнітэт і гатовы будаваць новы свет, заснаваны на павазе нацыянальных інтарэсаў дзяржаў».

Сітуацыю дакладна вызначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на II Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы: **«У наяўнасці крах усіх пастулатаў дэмакратыі. Мы бачым: ёсць дэмакратыя для сябе, а ёсць дэмакратыі на экспарт.** Якімі дэмакратычнымі каштоўнасцямі можна растлумачыць тое, што адбываецца на Блізкім Усходзе і тое, што адбылося ва Украіне? Няўжо верхам дэмакратыі з'яўляецца магчымасць фізічнага ўстаранення чалавека, якога, напрыклад, ЗША і яго сатэліты палічаць пагрозай для нацыянальнай бяспекі? Любога — ад палітычнага і грамадскага дзеяча да бізнесмена, вучонага або журналіста. Або новы «дэмакратычны» трэнд — палохаць Міжнародным крымінальным судом кіраўнікоў суверэнных дзяржаў».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«МАРАФОН» — ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ АБ'ЯДНАННЯ БЕЛАРУСАЎ

Маштабная рэспубліканская падзея праходзіць у Лідзе

Адзін з найбуйнейшых прамысловых гарадоў Гродзеншчыны 10 і 11 студзеня прымае акцыю «Марафон адзінства». Гэта 13-ы горад, куды завітаў грамадска-культурны фестываль пасля Маладзечна, Гомеля, Жлобіна, Магілёва, Бабруйска, Оршы, Віцебска, Пінска, Баранавіч, Брэста, Мазыра і Салігорска. «Марафон» сваё шэсце на Гродзеншчыне працягне 17 і 18 студзеня — акцыю прыме абласны цэнтр.

Першы дзень прынёс лідчанам нямала эмоцый. Сам факт правядзення марафону **старшыня Лідскага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ** ацэньвае як эстафету значнасці тых набыткаў, якія сталі магчымымі толькі ва ўмовах суверэннай і незалежнай дзяржавы. Удзельнікі і госці могуць пазнаёміцца з эканамічным і культурным патэнцыялам Ліды. Многія мерапрыемствы праходзяць на значных сацыяльных і прамысловых аб'ектах горада. Аляксандр Вярсоцкі адзначыў, што для яго як кіраўніка раёна і проста жыхара гэтыя месцы маюць асаблівае значэнне. Яны з'явіліся ў апошнія дзесяцігоддзі і дэманструюць, якія значныя аб'екты былі ўзведзены і працягваюць будаваць у нашай краіне.

Знаёмства з некалькімі такімі прадпрыемствамі адбылося ў рамках праекта «Адну справу робім». Ідэя яго — умацаванне сувязяў паміж калектывамі краіны. Гэтым разам адбылася сустрэча прадстаўнікоў прадпрыемства «Конус» НВЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі і ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Лідсельмаш». Заводы трывала супрацоўнічаюць. Па словах генеральнага дырэктара «Лідсельмаша» Рамана Трубіцкага, калегі дапамагаюць з ацынкаваннем, а ім пры неабходнасці, правядуць зварачныя альбо фрэзерныя работы. Сумесны ўдзел у праекце марафону яшчэ больш замацуе гэтыя сувязі, дасць штуршок інавацыйным рашэнням для паляпшэння якасці прадукцыі, упэўнены кіраўнік «Лідсельмаша». На «Конусе» гэту ініцыятыву поўнасцю падтрымалі. **Дырэктар прадпрыемства, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй ЖАМОЙДА** падкрэсліў, што завод, які быў пабудаваны 15 гадоў таму па ўказе Прэзідэнта, сёння ў ліку лідараў сярод прамысловых прадпрыемстваў Гродзеншчыны. Такіх габарытных ваннаў гарачага ацынкавання няма на постсавецкай прасторы. І ў Еўропе іх адзінкі. Тут аказваюць паслугі не толькі беларускім, але і замежным прадпрыемствам.

Сам факт сустрэчы для супрацоўнікаў абодвух заводаў стаў магчымасцю абмяняцца вытворчымі ідэямі, але не толькі. «Мы адчулі, што разам працуем на карысць будучыні краіны і здольны дасягнуць высокіх вынікаў. Дзякуй «Марафону адзінства»! У такія хвіліны разумееш, што ты частка чагосьці вялікага. А гэта надае сілы і аптымізму», — выказаў свае эмоцыі **маркетолаг завода «Конус» Павел ТРОН.** А душэўнасць сустрэчы дадало выступленне групы «АЎРА». Дарэчы, менавіта яе ўдзельнікамі напісаны гімн для Лідскага завода гарачага ацынкавання «Конус».

У рамках праекта «Разам працуем, разам спяваем» удзельнікі марафону завіталі на шэраг прадпрыемстваў горада. У іх ліку — «Ліда хлебапрадукт», «Лідапраммаш», «Лідскі ліцейна-механічны завод», «Каскад», ЛІППЛАСТ-СПБ». Перад працоўнымі калектывамі выступілі спявачка Улада, група «PROвокация», Гюнеш, Аляксандр Варанішча і іншыя. Для завадчан такая сустрэча стала сапраўдным падарункам. Яны выказвалі падзяку Прэзідэнту за магчымасць працаваць пад мірным небам. Прадстаўніца прадпрыемства «ЛІППЛАСТ-СПБ» Ганна лічыць адзінства вельмі важным складнікам грамадства. На яе думку, у Беларусі ўсе народы жывуць у згодзе, гэта робіць нашу дзяржаву сапраўды краінай для людзей, дзе кожны можа быць шчаслівым.

Меркаванне Ганны падтрымала яе калега з прадпрыемства «Ліда хлебапрадукт» Тарэса, якая працуе тут больш за 40 гадоў. Жаннына ўзрушана тым, што ёй давялося ўжывую ўбачыць вядомых беларускіх артыстаў, якія самі прыехалі парадаваць сваім мастацтвам. Яна ўпэўнена, што такія падзеі аб'ядноўваюць людзей, дораць надзею на будучыню.

Двухдзённая праграма мерапрыемстваў у Лідзе пачалася з экскурсій гасцей на прадпрыемствы Лідчыны. Так, юныя ўдзельнікі марафону з Віцебска змаглі ўбачыць працэс вытворчасці на ААТ «Лідскія харчовыя канцэнтраты» і прадэгуставаць прадукцыю. Для беларускіх блогераў правялі экскурсію па музеі лідскага бровара, экспазіцыя якога налічвае нямала экспанатаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Дарэчы, летась у рамках вытворчага турызму музей наведала больш як 30 тысяч чалавек.

Госці і ўдзельнікі марафону пазнаёміліся з багатай выстаўкай майстроў і рамеснікаў Прынёманскага краю ў Палацы культуры. Асабліва ўразілі старадаўнія віды рамёстваў, якія цяпер актыўна адраджаюцца ў Беларусі: гэта і саломка, і выцінанка, і керамка, і ткацтва. «Добра, што на марафоне ёсць магчымасць пашырыць веды аб гісторыі і культуры нашага краю. У нас столькі ўсяго прыгожага і цікавага! Да таго ж мы атрымалі шмат пазітыўных эмоцый ад сустрэч. Гасцей вельмі прыемна сустракаць», — падзялілася ўражаннямі мясцовая жыхарка Анастасія.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота БелТА.

«Марафон адзінства» пашырыць маршрут і пройдзе ў Наваполацку 13 і 14 студзеня.

Аб гэтым БелТА расказала кіраўнік рабочай групы па арганізацыі і правядзенні «Марафону адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА.

«Да нас пачалі звяртацца жыхары Наваполацка з вялікай просьбай прывезці «Марафон адзінства» ў іх горад. Мы не маглі не адрэагаваць і зрабілі ўсё магчымае, каб гэта свята адзінства пабывала ў Наваполацку і трошкі — у Полацку. Таму 13 і 14 студзеня мы крыху мяняем наш маршрут і да Гродна прыедзем у Наваполацк», — расказала Ганна Лукашэнка.

Паводле яе слоў, праграма «Марафону адзінства» ў Наваполацку будзе дастаткова шырокай. Нават нягледзячы на тое, што там не будзе фінальнага канцэрта, які завяршае «Марафон» у кожным горадзе.

КРЫНІЦА ДУХОЎНАСЦІ

Чым здзіўляе Прэзідэнцкая бібліятэка

За гады суверэннага існавання Беларусі дзякуючы падтрымцы дзяржавы ўдалося захаваць і развіць асноўныя дасягненні ў сферы культуры, у тым ліку і ў бібліятэчнай справе. Карэспандэнт «Звязды» даведалася, як па даручэнні кіраўніка дзяржавы праходзіў рамонт і мадэрнізацыя будынка Прэзідэнцкай бібліятэкі, хто сёння можа стаць яе чытачом, таксама ўбачыла на свае вочы, як ствараюцца лічбавыя фарматы выданняў і дзе захоўваюцца найстарэйшыя нумары газет.

«Днямі адбылося ўручэнне кіраўніком дзяржавы прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва. Захаванне нацыянальнай культуры і духоўнага адраджэння з'яўляецца фактарам развіцця нашай дзяржавы», — адзначыў **дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі Сяргей КВАЧАН.** У Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 22 студзеня 2022 года Прэзідэнт Беларусі адзначыў: «Мы зберажом і прымножым матэрыяльную і духоўную спадчыну пакаленняў, перададзім нашчадкам суверэнную і незалежную дзяржаву, наш агульны дом, дзе яны будуць адчуваць сябе ў бяспецы і камфорце. Гэта наш шлях! І праўда (а ў ёй сіла) — на нашым баку!» Яскравым прыкладам дзяржаўнай палітыкі ў гэтым кірунку з'яўляецца прыняцце і рэалізацыя шэрагу дзяржаўных праграм: «Культура Беларусі», «Замкі Беларусі», «Слуцкія паясы». За гады незалежнасці Беларусі ўдалося захаваць мноства культурных аб'ектаў у нашай краіне. Праведзены рэстаўрацыйныя работы ў Нацыянальным гісторыка-культурным запаведніку «Нясвіж», замкавым комплексе «Мір», Лідскім замку, Старым замку Гродна. Гэтыя аб'екты сталі брэндамі Беларусі. Таксама аб'ектамі для правядзення рэстаўрацыйных работ сталі руіны замка ў Навагрудку і Крэве, Гальшанах і Быхаве, а таксама ў шэрагу іншых беларускіх гарадоў і гарадскіх пасёлкаў».

Была распрацавана праграма рэканструкцыі тэхнічнага абсталявання дзяржаўных тэатраў. Яе мэта — прывядзенне будынкаў у належны стан. Была выканана рэканструкцыя і рэстаўрацыя Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. Важна адзначыць, што менавіта дзякуючы захаванню міру і стабільнасці ў грамадстве Беларусі сёння ёсць магчымасць рэканструкцыі і будаўніцтва аб'ектаў культуры. Урачыста быў адкрыты Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пасля рэканструкцыі прадставіў свае экспазіцыі для наведвальнікаў і Нацыянальны мастацкі музей. Плануецца будаўніцтва новага, сучаснага Нацыянальнага гістарычнага музея. «Як адзначаў Прэзідэнт, музеі створаны для таго, каб новае пакаленне ганарылася тым шляхам, які пройдзены папярэднімі пакаленнямі», — нагадаў Сяргей Квачан.

У красавіку 2008 года было прынята рашэнне аб рамонце і мадэрнізацыі будынка бібліятэкі на цяперашняй вуліцы Карла Маркса, 38.Туды планавалася перавесці ўвесь асноўны фонд. Рашэнне гэтай задачы было вельмі важным з-за недахопу плошчаў. Работы па вырашэнні дадзенага пытання пачыналіся яшчэ ў першай палове 1990-х. Для захавання фонду выкарыстоўвалася пяць непрыстасаваных памяшканняў у розных частках горада Мінска, а таксама падвальныя памяшканні Дома ўрада. Трэба было ажыццявіць велізарны пералік работ: правесці будаўніча-мантажныя работы, зрабіць перапланіроўку памяшканняў, ажыццявіць пракладку інжынерных камунікацый, ажыццявіць мантаж сучаснага інжынернага, тэхналагічнага і бібліятэчнага абсталявання. Перад невялікім калектывам бібліятэкі стаяла вялікая і складаная задача па перамяшчэнні больш як мільёна адзінак дакументаў. Як адзначыла **загадчыца аддзела абслугоўвання карыстальнікаў у рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Выканаўчым камітэце СНД Таццяна ЛЫЧАГІНА,** падчас перамяшчэння фонду дзверы бібліятэкі не зачыняліся, працягваўся прыём чытачоў у штатным рэжыме. Такі падыход для сусветнай бібліятэчнай практыкі вельмі рэдкі. У выніку мадэрнізацыі і рамонту будынка бібліятэка атрымала ўтульную чытальную залу, пад асноўныя дакументасховішчы адведзена больш за 3 тысячы квадратных метраў. Яно аснашчанае сучасным інжынерным абсталяваннем, якое забяспечвае аптымальную захаванасць фонду.

Пасля правядзення работ у 2012 годзе кіраўнік дзяржавы наведаў бібліятэку і азнаёміўся з вынікамі праведзеных работ і дзейнасцю бібліятэкі. Галоўная задача, якую ён паставіў, — забяспечыць агульнадаступнасць. Усе даручэнні Прэзідэнта супрацоўнікамі былі выкананы якасна і ў тэрмін. Сёння, пасля пэўнага перыяду эксплуатацыі, можна з упэўненасцю сказаць: дзякуючы рашэнню кіраўніка дзяржавы ў бібліятэцы былі створаны цудоўныя ўмовы для працы, забяспечваецца высокі ўзровень абслугоўвання наведвальнікаў.

Любы грамадзянін Беларусі можа прыйсці ў бібліятэку і атрымаць адказ на свой інфармацыйны запыт. «Калі нейкай кнігі няма ў фондзе, мы выкарыстоўваем сістэму міжбібліятэчнага абанемента. Напрыклад, Нацыянальная бібліятэка Беларусі прадстаўляе па запыце нам свае фонды, мы дзелімся сваімі. Больш за тое, усе абласныя бібліятэкі — таксама нашы абаненты. Працуем ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі нашай бібліятэкі. Месца ў нас утульнае, таксама ажыццяўляем абслугоўванне на працоўных месцах. Не заўсёды чалавек можна дайсці да нас», — адзначыла Таццяна Лычагіна.

Далей працягнула экскурсію **Жанна КРУПЕНЬ, загадчыца аддзела дакументазахавання Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі.** Яна падрабязна расказала аб сістэме захавання фонду. Зазірнулі і ў памяшканне для захавання газет. У ім размяшчаюцца стэлажы і паліцы, зробленыя спецыяльна пад заказ. У бібліятэцы расказалі, што газеты пераплятаюцца ў спецыяльныя падшыўкі, якія забяспечваюць захаванасць газетнай паперы, прадухіляюць траплянне вільгаці і пылу. Цвёрдая падшыўка забяспечвае зручнае захаванне. У сховішчы знаходзіцца больш за 500 найменняў і больш за 19 тысяч падшывак.

Як алічбоўваюцца дакументы, расказалі ў аддзеле фарміравання электроннай бібліятэкі. «Сёння ідзе актыўная работа па стварэнні лічбавых калекцый баз даных уласнай генерацыі па фарміраванні электронных бібліятэк. Такім чынам забяспечваюцца задачы па захаванасці фонду. Прытрымліваемся асноўных прынцыпаў работы бібліятэк: аператыўнасць і даступнасць атрымання інфармацыі нашымі карыстальнікамі. Бібліятэкай створаны такія лічбавыя калекцыі, як «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ў сродках масавай інфармацыі», а таксама «Хроніка дзейнасці першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі». Шырокім попытам карыстаецца база даных нашых дзяржаўных палітычных дзеячаў, якая дазваляе прасачыць станаўленне дзяржаўнага палітычнага дзеяча не толькі як асобы, але і як палітычнага лідара», — расказала **Вольга ЖУРОМСКАЯ, загадчыца аддзела фарміравання электроннай бібліятэкі Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі.**

Дарэчы, у фондзе захоўваецца больш як 1,5 мільёна найменняў выданняў. Вядзецца актыўная работа па вяртанні выданняў з усяго свету. «Нават з рэдкім фондам работнікі бібліятэкі выязджаюць на мерапрыемствы, наведваюць прадпрыемствы і заводы, каб паказаць людзям: вось гэта наша гісторыя, так выглядаюць першакрыніцы», — адзначыла **намеснік дырэктара Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі па асноўнай дзейнасці Ала ПЯНДО.**

Яна ВАЛАСАЧ.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ФОРУМ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

НА КАРЫСЦЬ МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ

Магілёўскі Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт пачынаюць рэалізацыю шэрагу цікавых праектаў

Пра гэта паведаміла **прарэктар БРУ па вучэбнай рабоце Наталля ВАЛОГІНА**. Стартам стала адкрыццё ў канцы года на базе БРУ беларуска-расійскага Цэнтра сучасных адукацыйных тэхналогій і гуманітарных навук. Гэта вынік падпісанага паміж ВНУ пагаднення падчас X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які прайшоў у чэрвені 2023 года ў Башкартастане. Удзел у адкрыцці цэнтра браў **прарэктар па міжнароднай дзейнасці СПДУ Сяргей АНДРУШЫН**.

— Сяброўства з расійскай ВНУ пачалося ў нас крыху раней, а Форум прыдаў яму канкрэтыку, — удакладніла суразмоўніца. — Улічваючы, што Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт глыбока класічны, а мы ВНУ — тэхнічная і ў нас няма вузкіх спецыялістаў па гуманітарных дысцыплінах, збіраемся развіваць міждысцыплінарнае супрацоўніцтва: праводзіць гістарычныя, рэгіянальныя, сацыяльна-палітычныя і іншыя даследаванні. У планах арганізаваць цыкл сумесных мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама правесці канферэнцыю, прысвечаную 200-годдзю паўстання дзекабрыстаў. У Санкт-Пецярбургскім універсітэце вельмі моцная школа гісторыкаў, у нас таксама шмат цікавай краязнаўчай інфармацыі на гэту тэму. Пэўны час у Магілёве нават быў музей дзекабрыстаў.

Універсітэты, па словах Наталлі Валогінай, разглядаюць магчымасці стварэння сеткавай адукацыйнай праграмы, але гэта патрабуе дэталёвай прапрацоўкі вучэбных планаў, выбудоўвання стратэгіі і падпісання асобнага дагавора аб рэалізацыі такога праекта. У якасці перспектыўнага кірунку разглядаецца праграмная інжынерыя.

У далейшым цэнтр будзе ўдаскональвацца. Мяркуецца, што разнапланавая дзейнасць паміж ВНУ пасадзейнічае пашырэнню акадэмічнай мабільнасці паміж студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім складам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего

Открытому акционерному обществу «Щучинагропродукт»

Аукцион состоится 12.02.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 422/С-32457 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание винзавода), общей площадью 3911,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, винзавод около ог. Руткевичи; - капитальное строение, инв. № 422/С-32458 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание проходной), общей площадью 158,5 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, проходная около аг. Руткевичи; - капитальное строение, инв. № 422/С-72450 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 4096,8 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А/2, сооружение благоустройства; - линия электропередач кабельная (электроустановки РУ-0,4 кВ, КЛ-04 кВ, ВУ и внутреннее электрооборудование винзавода). Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425886500012000029, площадью 0,2506 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений винзавода), расположенном по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, 39А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадь 1,3938 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0595 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0501 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 1,2713 га
Начальная цена продажи	497 409,56 руб. (четыреста девяносто семь тысяч четыреста девять рублей пятьдесят шесть копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	49 740 руб. (сорок девять тысяч семьсот сорок рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 10.02.2025 г. до 15.00**
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот № 1:
1) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22070 (наименование: проходная мех. двора, инв. № 018; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 46,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га, составные части и принадлежности: ограждение;
2) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22069 (наименование: гаражи, инв. № 016; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 1014,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А/1, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га;
3) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22062 (наименование: склад материальный, инв. № 019; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1007,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А/2, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	48 276,00	**Размер задатка, руб.**	4 827,60

Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 150/С-23295 (наименование: столовая, инв. № 330; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 334,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 14, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000151, площадью 0,1967 га, составные части и принадлежности: 1 – уборная н. ч., а – скважина, б – септик, в – ограждение, г – дворовое покрытие, (1) – уборная п. ч.

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	23 868,00	**Размер задатка, руб.**	2 386,80

Лот № 3: капитальное строение с инвентарным номером 150/С-23271 (наименование: колбасный цех, инв. № 286; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 872,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 31, 0,09 км севернее аг. Дворец, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001450, площадью 0,6467 га, составные части и принадлежности: 1 – пристройка, 2 – пристройка, 3 – навес, 4 – проходная, 5 – весовая, 6 – уборная н. ч., 7 – навес для соли, 8 – склад для топлива, 9 – склад для топлива, а – благоустройство территории, б – дезбарьер, в – дезбарьер, ж – дезбарьер, к – площадка для ТБО, г – септик, и – септик, д – база предубойного содержания скота, е – база предубойного содержания скота, м – ограждение, (6) – уборная п. ч., л – емкость 3 куб. м

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	152 400,00	**Размер задатка, руб.**	15 240,00

Продавец: ОАО «Дворецкий» Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Дворец, ул. Школьная, 3, тел./факс 80164793432. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Обременение:** наличие действующего договора аренды

Аукцион состоится 28 января 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 27 января 2025 г. до 17.00

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Память-В»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1797	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59890 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – здание цеха по изготовлению памятников, общая площадь – 464,4 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное блочное облицованное кирпичом здание цеха по изготовлению памятников с сараем, навесом, складом) Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59735 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы, общая площадь – 50,3 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное деревянное облицованное кирпичом здание конторы с холодной пристройкой, сараем) Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59888 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание бытовки, общая площадь – 16,1 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное блочное здание бытовки с навесом, уборной) Имущество, согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/pamjat-v/01-proizvodstvennaja-baza/list-1.pdf	124 574,76	12 457,48	6228,74

В отношении лота проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 235 (30369) от 03.12.2024, стр. 14

Местонахождение:
222410, Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 3

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000034, площадь 1,7933 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений, на праве постоянного пользования

Дата и время проведения торгов	**24 января 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	с 10.00 13 января 2025 года до 16.00 22 января 2025 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Память-В», проводимых 24.01.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
Тыя беларусы, якіх на Гульні дапусцілі, у Парыжы прадэманстравалі сапраўды гераізм і спартыўны дух. У авангардзе — батутысты. Іван Літвіновіч стаў першым у гісторыі двухразовым чэмпіёнам па скачках на батуце. Віялета Бардзілоўская — сярэбраны прызёр Алімпіяды. Яўген Залатой стаў сярэбраным прызёрам у спаборніцтвах па акадэмічным веславанні. Гэта першы для Беларусі медаль у мужчын-акадэмістаў. Яўген Ціханцоў узяў рэванш за няўдалае выступленне на Алімпіядзе ў Токіа і з Парыжа прывёз бронзавы медаль. І нягледзячы на цікавяць найперш медалі, не варта забываць, што чацвёртае месца байдарачніка Уладзіслава Краўца ці выхад у фінал плыўчыхі Аліны Змушко — таксама выдатны вынік на Алімпійскіх гульнях.

З НАДЗЕЯЙ НА ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

Пытанне ўдзелу беларусаў у зімовых Алімпійскіх гульнях — 2026, як і ў цэлым знясце санкцый залежыць ад выбараў прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта, якія пройдуць у сакавіку. Так, летась МАК дапусціў беларусаў на Алімпійскія гульні. Але рашэнне аб допуску спартсменаў на кваліфікацыйныя старты і іншыя спаборніцтвы прымаюць міжнародныя федэрацыі па відах спорту — а там у кожнага свае сімпатыі ці антыпатыі. Новы кіраўнік МАК можа паспрыяць змяненням у сусветным спорце. Адзін з кандыдатаў, якога лічаць фаварытам, Себасцьян Коў даў зразумець, што беларусаў і расіян вяртаць не хоча. Міжнародная асацыяцыя лёгкаатлетычных федэрацый, якую ён зараз узначальвае, упарта выступае катэгарычна супраць вяртання нашых спартсменаў. Падобную пазіцыю займае і швед Юхан Эліаш, прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту і снаўборда. На пасаду прэзідэнта МАК балатуюцца таксама прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі Марынарі Ватанабэ і прэзідэнт Міжнароднага саюза веласіпедыстаў Давід Лапарцьян. А гэта лаяльныя да нашых спартсменаў арганізацыі, якія знялі міжнародны бан. Будучым прэзідэнтам МАК імкнецца стаць алімпійская чэмпіёнка па плаванні Кірсці Ковентры. Можна спадзявацца на тое, што сама ў нядаўнім мінулым спартсменка яна разумее, каму найперш шкодзіць адхіленне. Вялікія чаканні ўскладаюць на іспанца Хуана Антоніа Самаранча малодшага. Яго бацьку называюць адным з найлепшых кіраўнікоў МАК у гісторыі. Хуан Антоніа Самаранч у 1990-я актыўна дапамагаў Беларусі ў стварэнні свайго Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Хочацца верыць, што алімпійскія ідэалы перадаюцца генетычна.

ШТО ПАКУЛЬ БАЛІЦЬ...

Пакуль жа інфармацыя аб удзеле беларусаў у Алімпійскіх гульнях 2026 года неадназначная. Міжнародны саюз канькабежцаў дапусціў канькабежцаў, фігурыстаў, шорт-трэкістаў да ўдзелу ў алімпійскай кваліфікацыі. «У гэтага допуску прысутнічае маса абмежаванняў, якія абыдуць не ўсе. Ёсць падазрэнне, што «абражуць» менавіта лідараў зборнай і дапусцяць не самых галоўных прэтэндэнтаў на ўзнагароды», — адзначыў Ігнат Галавацюк, лідар зборнай па канькабежным спорце.

Цяжкая сітуацыя з Міжнароднай федэрацыяй лыжнага спорту і снаўборда. «Зараз мы можам з упэўненасцю заявіць, што ніводны расійскі або беларускі спартсмен, а таксама трэнер або любы член персанала не будзе запрошаны да ўдзелу ў Кубку, чэмпіянаце свету ці іншым турніры пад эгідай FIS да наступнага апавяшчэння», — заявілі ў арганізацыі. Не могуць выступаць на міжнародных стартах фрыстайлісты, якія з кожнай Алімпіяды прывозяць медалі. Міжнародны саюз біятланістаў допуск беларусаў нават не разглядае. А дарэмна, нашы спартсмены маглі б упрыгожыць міжнародныя спаборніцтвы. Антон Смольскі, напрыклад, выйграў агульны залік Кубка Садружнасці сезона 2023/2024. Ды і цяпер Дзінара і Антон Смольскія, Ганна Сола, Дзмітрый Лазоўскі не здаюць лідарскіх пазіцый на этапах Кубка Садружнасці.

Абнадзеіў хакей. Кіраўнік Міжнароднай федэрацыі хакея Люк Тардзіф днямі заявіў, што неабходна як мага хутчэй «адчыніць дзверы» для беларусаў і расіян, каб была магчымасць скласці зразумелы графік спаборніцтваў. Плануецца, што канчатковае рашэнне будзе вынесена ў лютым.

Разам з тым прадстаўнікі зімовых відаў спорту без справы не сядзяць. На гульні хакейнага «Дынама-Мінск» збіраецца поўная «Мінск-арэна». Летась «Дынама-Мінск» стаў першым клубам у Кантынентальнай хакейнай лізе, які пакарыў неба. Ліўрэя аднаго з самалётаў авіякампаніі «Белавія» ўпрыгожана ў фірмавым стылі каманды. Вялікае спартыўнае свята ў лютым будуць прымаць «Раўбічы». Тут пройдуць спаборніцтвы біятланістаў Беларусі і Расіі — «Кубак мацнейшых спартсменаў». Праграма ўключае шэсць дысцыплін і будзе дубліраваць перадалімпійскі тыдзень.

...І ЗА ШТО ВАРТА РАДАВАЦЦА

Спецыялісты неаднаразова падкрэслівалі, што міжнародны бан дапамог больш увагі ўдзяліць дзіцячаму і юнацкаму спорту. Санкцыі санкцыямі, а рэзерв рыхтаваць трэба. У мінулым годзе юныя беларусы выдатна выступалі на спаборніцтвах у Расіі. Летнія «Дзеці Азіі» прынеслі беларусам 78 медалёў, а зімовыя «Дзеці Прымор'я» — 13 узнагарод. Трэба пашыраць гарызонты. Еўрапейскія алімпійскія камітэты (ЕАК) дапусцілі магчымасць удзелу беларусаў у Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестывалях 2025 года. Першы з падобных форумаў ужо ў лютым пройдзе ў Грузіі. Верым у лепшае.

Днямі стартуе першы ў новым годзе турнір серыі «Вялікага шлема» па тэнісе — Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі, які два гады запар выйгравала Арына Сабаленка. Летась яна зноў стала першай ракеткай свету. Таму сумна аматарам беларускага тэніса не будзе. У мінулым годзе нацыянальная зборная па пляжным футболе заняла чацвёртае месца — гэта быў сапраўдны фурор. Каманда ўжо пачала падрыхтоўку да чэмпіянату свету 2025 года. Падрыхтоўку да галоўнага старту сезона — чэмпіянату свету па водных відах спорту — пачалі і плыўцы. У іх мінулы год таксама быў паспяховым: на пяці этапах Кубка свету заваявалі 17 медалёў, а пад канец года — два медалі чэмпіянату свету, абнавілі мноства нацыянальных рэкордаў.

Сёлета свой клас на міжнароднай арэне абяцаюць паказаць барцы, цяжкаатлеты, гімнасты, самбісты, весляры, баксёры — да міжнародных стартаў дапушчаны 28 федэрацый па 35 відах спорту. І гэта ўжо нядрэнна. Але ў 2025-м хацелася б радавацца перамогам спартсменаў на міжнародных стартах, а не таму факту, што іх туды дапусцілі.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з адкрытых крыніц.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 22.01.2025.

Лот № 1: Продовольственный магазин
с инв. № 400/D-152911, площадь – 1653,50 кв. м.

Адрес: Гродненская обл., г. Гродно, пр-т Космонавтов, 27-81.
Земельный участок № 440100000002000751, 0,2169 га.
Право постоянного пользования.
Обременения: Аренда, Ипотека.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 360 800,00 долларов США.
Задаток – 475 667,64 руб.
Шаг электронных торгов – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **17.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 85 %, НА 90 %

Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1

Продавец: КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.

Торги состоятся 24 января 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ириинская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28

Подробный перечень имущества с ценами в количестве 28 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе Аукционы – «Очные торги».**

Дополнительное размещение на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by в разделе «Экономика / Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества».

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 13.01.2025 по 22.01.2025 с 9.00 до 16.00.**

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 06.04.2023 г. № 14, в газете «Звязда» от 06.04.2023 г. № 69 (30203).

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по тел.: **8 (033) 634-86-95** Насонов Николай Владимирович (правовая информация, запись на осмотр имущества); **8 (029) 835-67-42** Насонов Владимир Валерьевич.

Контактные данные:
(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.
E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru

УНП 491382947

В **суд Минского района** поступило заявление Тамулёнок Екатерины Михайловны о признании ДРАГУНА Дмитрия Владимировича, 15.09.1972 года рождения, безвестно отсутствующим, последнее известное место жительства – г. Логойск, пер. Борисовский 3-й, д.11а. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду Минского района по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 119а, каб. 512, в течение двух месяцев со дня публикации объявления.

Центр Промышленной Оценки

• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «Потсдам» г. Лида, Гродненская обл., г. Лида, ул. Летная, 4
Оператор/ Адрес ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by**
Предмет электронных торгов:	
Лот № 1 – 184/357 доли в праве собственности на нежилое помещение (Помещение многофункциональное), инв. № 420/D-7291, общ. пл. 359,0 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Ленинская, д. 7. В состав лота входит иное имущество: сигнализация охранная, инв. № 20151, вентиляционная система, инв. № 20121. ***Обременение:*** договор аренды	
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 279 120,00 бел. руб.	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов	
Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение и затраты за проведение независимой оценки продавцу, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона	
Извещение о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 17.12.2024	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 24.01.2025. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.01.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by	

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Вороновская сельхозтехника», Гродненская обл., Вороновский р-н, д. Бояры. УНП 500007686
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов (имущество реализуется одним лотом)
Местоположение –
Гродненская обл., Вороновский р-н, Заболотский с/с, 2

Производственная база в составе:
здание столярного цеха (454,8 кв. м, 421/С-1876, составные части – пристройка), **здание мастерских** (1292,3 кв. м, 421/С-1879, составные части – заборы, ворота, проезжая часть, участки линий электропередач), **здание пункта технического ухода** (412,4 кв. м, 421/С-1882), **здание проходной** (24,9 кв. м, 421/С-1881, составные части – терраса), **здание конторы** (233,7 кв. м, 421/С-1877, составные части – две пристройки), **склад газовых баллонов** (23 кв. м, 421/С-3185), **навес** (501,4 кв. м, 421/С-3184).
Сведения о земельных участках: предоставлены продавцу на праве постоянного пользования пл. **5,7861 га** для размещения объектов промышленности (ограничения (обременения) – охранные зоны линий электропередачи пл. 0,5000 га) и **0,0057 га** для обслуживания склада газовых баллонов

Начальная цена с НДС 20 % – 79 024,04 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.12.2024 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 12.00 24.01.2025 г.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.01.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «РеалтЭксперт»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 24.01.2025 г.

Лот № 1: Литер А З/к, здание административно-бытового корпуса
с инв. № 500/С-31257, 1500,0 кв. м.

Адрес: Республика Беларусь, г. Минск, Петруся Бровки, 30.

Начальная цена с НДС 20 % – 811 620,00 руб.
Задаток – 81 162,00 руб.

Капитальное строение с инв. № 500/С-31257 расположено на земельных участках №№ 500000000009001245 (право постоянного пользования, 4,7254 га), 500000000009006469 (право аренды, 0,0088 га), 500000000009006470 (право аренды, 0,0030 га). Доля: 1/2.

На земельных участках расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **21.01.2025 г. в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

АД КАСПІЯ ДА СВІСЛАЧЫ

Як туркменка стала выкладаць кітайскую мову ў Беларусі

Лола Рахімбаеўна АТАДЖАНАВА нарадзілася і вырасла ў Туркменістане, але вось ужо шосты год жыве ў Беларусі, а трэці — працуе настаўніцай у сталічнай гімназіі № 36. Пра вучобу, выбар прафесіі і рашэнне застацца ў беларускай сталіцы дзяўчына расказала ў інтэрв'ю «Звяздзе».



— Лола Рахімбаеўна, чаму вы пераехалі ў Беларусь?

— Мае бацькі вельмі хацелі, каб я вучылася за мяжой. Выбар прыпаў на Беларусь — краіну з камфортнымі ўмовамі жыцця і выдатным узроўнем адукацыі. Да таго ж, беларускі народ вельмі прыязны, а значыць, бацькі маглі не перажываць за мае дабрабыт і бяспеку. Вось так і здарылася, што пасля заканчэння школы ў 2018 годзе я прыехала ў Мінск паступаць на філалагічны факультэт БДУ, выбраўшы спецыяльнасць «Усходняя філалогія».

— Баяліся цяжкасцяў з-за моўнага бар'ера?

— Не, з гэтым праблем не было. Руская — мая другая родная мова пасля туркменскай. Але, наколькі я ведаю, нават тыя замежныя студэнты, якія прыязджаюць, не ведаючы мовы, могуць вывучыць яе на дадатковых занятках. Вельмі многія мае знаёмыя за гады вучобы ва ўніверсітэце свабодна загаварылі па-руску.

— Чаму вырашылі вывучаць менавіта кітайскую мову?

— Насамрэч першапачаткова я рыхтавалася звязаць свой лёс з зусім іншым заняткам: маці з татам вельмі хацелі, каб іх дачка стала менеджарам або эканамістам. Але хутка я зразумела, што да гэтага ў мяне не ляжыць душа. Затое падабаюцца замежныя мовы і літаратура. Тады бацькі падтрымалі маё захапленне, прапанаваўшы паступаць на філфак. А кітайская мова лічылася на той момант вельмі перспектыўнай спецыяльнасцю.

— Якімі былі вашы першыя ўражанні ад Беларусі і, у прыватнасці ад сталіцы?

— Адразу кінулася ў вочы, наколькі Мінск чысты горад. А яшчэ нельга было не заўважыць вялікую колькасць гістарычных будынкаў, асабліва ў цэнтры. Здавалася, што я знаходжуся ў дэкарацыях нейкага фільма. На маёй Радзіме архітэктура зусім іншая, ды і не толькі яна. Моцна адрозніваюцца ландшафт, прырода. Напрыклад, па прылёце ў Туркменістан перш за ўсё вы ўбачыце пяскі, потым — Каспійскае мора. А ў Беларусі шмат лясоў і лугоў, рэк і азёр.

— Мусіць, і розніцу ў клімаце адразу заўважылі?

— Гэта дакладна. У Туркменістане заўсёды цёпла, нават зімой. У Беларусі ж можна і пад дождж трапіць, і ў сумёт упасці. Да такога надвор'я я доўга прывыкала. Да пераезду, вядома, даводзілася чуць ад знаёмых, што беларускія зімы часам не слабейшыя за рускія маразы, але я чамусьці не верыла.

Затое калі заснежаныя вуліцы асвятляюцца гірляндамі, паўсюль упрыгожаны ёлкі і расстаўлены навагоднія дэкарацыі, адчуваецца дух надыходзячых свят, Раства. Амаль як у казках або фільмах пра чараўнікоў.

— З якімі складанасцямі даводзілася сутыкацца пасля пераезду?

— Не столькі складана было вучыцца, як рабіць гэта падчас пандэміі. Каранцін прынёс у жыццё мноства перажыванняў. Уявіце сабе: мала таго што знаходзішся далёка ад дому, дык яшчэ і не ведаеш, калі з'явіцца магчымасць пабачыць родных. Было маральна цяжка жыць у стане трывогі і нявызначанасці ажно два гады. Да таго ж навучанне ўвесь гэты час было дыстанцыйным, з-за чаго і стажыроўкі ў Кітаі прыйшлося адмяніць.

— Якія беларускія традыцыі ці святы вам запомніліся?

— Аднойчы мае беларускія сябры запрасілі мяне на Купалле. Якое ж гэта было захапленне! Да таго моманту я і падумаць не магла, што такое свята не проста існуе, але і актыўна адзначаецца ў народзе: з кірмашамі, песнямі, танцамі і, вядома, касцюмамі.

А яшчэ я кожны раз з вялікай цеплынёй і трапятаннем успамінаю адну філфакаўскую традыцыю. Першакурснікаў прынята збіраць у Вязынцы — вёсцы ў Мінскім раёне, дзе нарадзіўся Янка Купала. Вось і нас, памятаю, завезлі, правялі экскурсію. А потым былі конкурсы, танцы і напрыканцы — гарачая грэцкая каша каля вогнішча.

— Як думаеце, што беларусам было б цікава даведацца пра вашу краіну?

— Шчыра кажучы, мае вучні і калегі часта мяне пра яе распытваюць. Асабліва дзеці. З мілай цікаўнасцю падбягаюць і пытаюцца: «А адкуль вы прыехалі?» Потым ідзе просьба: «А скажыце што-небудзь на сваёй роднай мове». І я заўсёды з вялікай радасцю адказваю. Бо хочацца, каб людзі больш ведалі пра туркменскую мову, нашы традыцыі і звычаі, адзенне, захапляліся прыгажосцю прыроды маёй Радзімы. Гісторыя і культура Туркменістана вельмі старажытная і багатая, таму мне ёсць чым ганарыцца і чым дзяліцца з зацікаўленымі.

— Чаму вы, скончыўшы філфак БДУ, вырашылі стаць настаўнікам?

— Пасля заканчэння ўніверсітэта нам прысвойвалася тры спецыяльнасці: філолаг, выкладчык і перакладчык. Калі надышоў час шукаць работу, усе рваліся ў перакладчыкі, але ў мяне з гэтым неяк не склалася. Таму на апошнім курсе, калі была вытворчая практыка, размеркавалася ў 36-ю гімназію Мінска. Выявілася, што ў мяне нядрэнна атрымліваецца ладзіць з дзецьмі, вельмі падабаецца выкладаць. Я знайшла ў гэтым сваё прызванне і засталася працаваць у гімназіі настаўнікам кітайскай мовы, а таксама класным кіраўніком.

— Здаецца, дзеці да вас самі цягнуцца. У чым сакрэт?

— Я проста імкнулася быць з імі на роўных. Не сюсюкацца, не глядзець пагардліва як старэйшая і мудрэйшая. Мая мэта — стаць дзецям сябрам. І такая методыка, такі падыход дае свой плён. Строгай мяне, можа, і не назваць, але я лічу сябе даволі патрабавальнай настаўніцай. Мае калегі гавораць, што я дзейнічаю па прынцыпе мяккай сілы.

— Будучы маладым спецыялістам, ды яшчэ і з іншай краіны, мабыць, спачатку было няпроста ўліцца ў працоўны працэс?

— Мне вельмі пашанцавала з самага пачатку майго прафесійнага шляху трапіць у цудоўны дружны калектыў. Вядома, узнікалі нейкія цяжкасці, пытанні, але яны хутка вырашаліся дзякуючы калегам і адміністрацыі. Калі я ўладкоўвалася, у гімназіі ўжо быў выкладчык кітайскай мовы. А значыць, была напрацавана база, нейкі падмурак, які заставалася толькі далей развіваць. Вядома, спачатку не хапала вопыту, але ўсе ставіліся да гэтага з разуменнем і павагай.

Тое ж самае магу сказаць і пра бацькоў маіх вучняў. Магчыма, першапачаткова ў іх і былі сумненні. Зразумела, не кожнаму хацелася б бачыць класным кіраўніком свайго дзіцяці настаўніка, які сам толькі-толькі ўніверсітэт скончыў. Але ж яны ў мяне паверылі, даверыліся мне. Таму і я так трапятліва стаўлюся да сваіх вучняў.

— Чаму засталіся ў Беларусі, а не вярнуліся ў Туркменістан?

— Вельмі спадабалася працаваць настаўніцай: размаўляць з дзецьмі, вучыць іх кітайскай мове, шукаць новыя падыходы. Да таго ж склаліся цёплыя адносіны з класам, у якога я выкладала падчас сваёй практыкі. Не апошнюю ролю адыгралі таксама атмасфера, што пануе ў гімназіі, і зладжаная праца калектыву і кіраўніцтва. Таму, калі з'явілася магчымасць працаваць тут пасля выпуску, я загарэлася гэтай ідэяй. А бацькі падтрымалі маё жаданне застацца ў Мінску.

Я планую і надалей жыць у Беларусі, атрымаць катэгорыю настаўніка кітайскай мовы і скончыць магістратуру. Каб развівацца ў прафесіі, патроху шукаю варыянты стажыроўкі ў кітайскім універсітэце. А да таго часу вучуся і працую ў сваё задавальненне, бо займаюся любімай справай. Насамрэч гэта ўжо вялікае дасягненне.

Аміна НАЗАРАВА.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Вы падсвядома гатовы да барацьбы за свае інтарэсы. Але неабходна змяніць стратэгію і тактыку, зрабіўшы ўпор на дыпламатыю і жаданне дамовіцца. Дзейнічайце мякчэй, будзьце дабрэй, змяніце гнеў на літасць, так будзе лягчэй і вам, і навакольным. Трымаючы сябе ў жорсткіх межах ветлівасці і велікадушнасці, вы можаце атрымаць нечаканае павышэнне па службе або які-небудзь іншы, але не менш прыемны падарунак лёсу.

ЦЯЛЕЦ. Выдатны тыдзень для інтэлектуальнай працы, камандзіровак і падарожжаў. У панядзелак і аўторак супрацьпаказаная паспешнасць, калі хочаце пазбегнуць перанапружання і нервовых зрываў. У пятніцу лепш устрымацца ад актыўнай дзейнасці, паспрабуйце быць пераборлівым у кантактах. Лішняя балбатня цяпер ні да чаго не прывядзе. Выхадныя дні будзьце разам з сям'ёй.

БЛІЗНЯТЫ. Спрыяльны час для ўвасаблення ў жыццё нават самых арыгінальных і фантастычных ідэй. Вас зразумеюць і вам дапамогуць. Любімы чалавек гатовы выканаць любую просьбу. Пастаўцеся да жыцця па-філасофску: усё, што адбываецца, — да найлепшага. Гэта ваша дарога да кахання, гармоніі і шчасця.

РАК. На гэтым тыдні могуць скласціся спрыяльныя ўмовы, каб вы змаглі сябе праявіць і зрабіць уражанне на патрэбнага чалавека. Калі будзеце актыўныя, лёгка дасягняце вынікаў. У пятніцу можаце звярнуцца да начальства з просьбамі і пажаданнямі, у гэты дзень яно будзе добразычлівае ў адносінах да вас. У суботу чакайце навін ад блізкіх людзей.

ЛЕЎ. Паспрабуйце ісці да сваёй мэты, не звважаючы на мітусню. Усе рашэнні неабходна прымаць на цвярозую галаву, не дазваляючы эмоцыям умешвацца ў працэс. У сярэдзіне тыдня магчымы пэўныя праблемы ва ўзаемаадносінах з калегамі. У пятніцу вас можа наведаць нечаканае жаданне пайсці на спатканне і штосьці змяніць у сваім асабістым жыцці. У выхадныя не пачынайце ніякай справы з дрэнным настроем, паспрабуйце спачатку яго выправіць.

ДЗЕВА. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на кар'ерны рост, бо магчымыя змяненні на рабоце. Каб дабіцца так неабходнага вам поспеху, трэба прадумваць усе дробязі і дэталі. З рызыкоўнымі планамі і дзеяннямі пажадана пачакаць, не апярэджвайце час. Паспрабуйце не забываць пра асабістае жыццё, цалкам сышоўшы ў працу.

ШАЛІ. Давядзецца напружана працаваць, каб дасягнуць жаданага, затое ёсць шанц атрымаць поспех. Не саромейцеся праяўляць смеласць і настойлівасць. Вы знаходзіцеся ў цудоўнай фізічнай і інтэлектуальнай форме, так што максімальна скарыстайцеся гэтай сітуацыяй. У выхадныя вас могуць парадаваць раманцтыкай і дарагімі падарункамі. Цяпер важна захоўваць спакой і не рабіць паспешлівых вывадаў.

СКАРПІЁН. Тыдзень падорыць поспех у справах, прыбытак і выдатнае самаадчуванне. У панядзелак могуць парадаваць цікавыя навіны. У гэты дзень вы будзеце размаўляць больш, чым звычайна. У аўторак будзе нялішне прадэманстраваць упэўненасць ва ўласных здольнасцях, вы лёгка завалоеце аўтарытэт лідара, паспяхова ўздзейнічаючы на людзей. У чацвер атрымаеце вельмі прывабную прапанову ад начальства.

СТРАЛЕЦ. Гэты тыдзень можа прынесці вызначанасць у пытанні трываласці сувязі з дзелавымі партнёрамі. Верагодная далёкая паездка, падчас якой круг карысных знаёмстваў пашырыцца. У аўторак лепш прамаўчаць, нават калі вы ўпэўнены ў сваёй праваце. Запярэчыце пазней. У пятніцу вас чакае дадатковы прыбытак. У выхадныя варта аддаць увагу хатнім справам.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні паспрабуйце не прымаць паспешлівых рашэнняў, будзьце мудрыя і прадбачлівыя, тады вы з лёгкасцю абыдзеце перашкоды і даможацеся жаданага. Прыслухайцеся да інтуіцыі, яна падкажа самае дакладнае рашэнне ў існай сітуацыі. Тыдзень будзе ўдалым для пошукаў работы і наладжвання дзелавых адносін. У асабістым жыцці зараз лепш нічога не мяняць. Дзеці могуць завяліць вас сваімі праблемамі, але выхадныя пройдуць лёгка і прыемна.

ВАДАЛІЙ. Вам відавочна хочацца адзіноты і адпачынку, але можаце апынуцца ў гушчы падзей і ў акружэнні людзей. Аўторак можа аказацца днём высокай працаздольнасці, на вашы поспехі можа звярнуць увагу начальства, верагодны кар'ерны рост. У чацвер выявіце ўвагу і клопат, і вам адкажуць узаемнасцю. Хутка атрымаеце дапамогу для ажыццяўлення ўласных планаў. У нядзелю пажадана быць у баку ад падзей, у гэты дзень лепш назіраць, а не дзейнічаць.

РЫБЫ. Без асаблівых ваганняў ажыццяўляйце вашы смелыя ідэі. Сітуацыя можа садзейнічаць прыняццю сур'ёзных і адказных рашэнняў. Не забывайце прыслухоўвацца да парад калег. Паспрабуйце пераглядзець вашы адносіны з блізкімі людзьмі: магчыма, вы сталі залішне запальчывыя і няўважлівыя. Добра было б знайсці кампраміс.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

11 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1888 год — нарадзіўся (г. Заслаўе) Язэп Пятровіч Карэневіскі, дзяржаўны дзеяч Беларусі, педагог, правадзейны член Інбелкульта. З 1915 года выкладаў у Мінскім настаўніцкім інстытуце, быў членам культурна-асветніцкага гуртка «Наш край», з 1917 года — арганізацыі «Маладая Беларусь».

1910 год — нарадзіўся Андрэй Аляксандравіч Булінскі, кінааператар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і Дзяржаўнай прэміі СССР.

1939 год — нарадзіўся (г. Гомель) Анатоль Анатольевіч Кавалёў, беларускі вучоны-фізік, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

У свеце

1569 год — у Англіі была разыграна першая афіцыйна засведчаная латарэя. Яе розыгрыш адбыўся ў лонданскім кафедральным саборы св. Паўла.

1700 год — у Расіі замест візантыйскага календара ўведзены юліянскі каляндар. Пасля 31 снежня 7208 года настала 1 студзеня 1700 года. Пачатак года перанесены на 1 студзеня.

1919 год — дэкрэтам Савета народных камісараў на ўсёй тэрыторыі Савецкай Расіі была ўведзена харчовая развёрстка. Яе сутнасць заключалася ў абавязковай здачы сялянамі дзяржаве ўсіх лішкаў хлеба і іншых прадуктаў па фіксаваных цэнах, але, па сутнасці, прадукты проста канфіскоўвалі, і адмовіцца ад такой «здзелкі» селянін не мог. Падобныя меры прымала некалькімі гадамі раней і царская ўлада — падчас Першай сусветнай, і Часовы ўрад. Такім чынам, Савецкая дзяржава працягнула гэтую лінію, аднак у пашыраным варыянце. Яна стала часткай так званай палітыкі ваеннага камунізму.

1922 год — у Канадзе ўпершыню для лячэння дыябету быў ужыты інсулін.

АЛЁНАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

КАЛІ ГРЫШКА ПЕРШЫ З ЛЫЖКАЙ

Людзей, якія цалкам задаволены сваёй знешнасцю, мусіць, няшмат. Многім не падабаецца рост ці вага, аб'ём грудзей, форма вушэй ці носа, колер вачэй, а ўжо валасоў...

Зрэшты, з ім, як здаецца, цяпер найпрасцей: у крамах аж вочы разбягаюцца ад колькасці фарбаў! Не тое, што некалі. Сяброўка маёй матулі, напрыклад, пастаянна паласкала валасы адварам рамонку — марыла, што ўрэшце яны пасвятлеюць... А вось мама мая (светлай памяці!) бландзінкай была, але ж косы колеру спелай пшаніцы ёй вельмі не падабаліся, і яна, каб хоць трохі пабыць брунеткай, мазала галаву... сажай.

...Знаёмыя вяскоўцы расказалі пра яшчэ адзін вельмі арыгінальны спосаб фарбавання. У тыя пасляваенныя гады людзям вельмі цяжка жылося. Першай марай у многіх сем'ях было пад'есці — ды хоць чаго! У сямейцы з трох чалавек — мама і два хлапчукі — за ласунак лічылася звычайная фасоля. Адзінае — маці, ад цямна да цямна працуючы ў калгасе (а дома ж яшчэ і гаспадарка), часам не паспявала паставіць яе ў печ. І тады кашаварыць пачынаў Лёня, старэйшы з сыноў. Праўда, кухар ён быў зусім неважнецкі: вада ў чыгунку часцяком выкіпала, фасоля прыгарала. Зверху яшчэ магла быць так сабе, ядомай, а вось на дне фасоліны выглядалі, як тое вугалле.

Тут трэба сказаць, што сам Лёнька хлопец быў дужы, чарнавалосы: казалі, што ўвесь у нябожчыка бацечку. А вось Валодзька — яго меншы брат — па маці пайшоў: кволы, бялявы... Не хацелася яму такім заставацца, за братам гнаўся.

Добра ведаючы гэта, Лёня вырашыў «пажартаваць»: прапанаваў малому есці ўсё падгарэлае. Ад яго, маўляў, валасы абавязкова пацямнеюць!

Такім чынам старэйшы брат кожны раз уплятаў «вяршкі», малодшаму — заставаліся «карэньчыкі». Падгарэлая фасоля — смак яшчэ той — аж храбусцела ў малога на зубах!.. Але ж — дзеля прыгажосці і пастаўленай мэты — на што чалавек не пойдзе, асабліва ў дзяцінстве?! Вось і гэтае беднае дзіця штораз пасля ежы ўглядалася ў невялічкае люстэрка, якое вісела на сцяне, глядзела, ці пацямнелі ж валасы?

На вялікі жаль, іх колер не мяняўся і не змяніўся нават тады, калі хлопец стаў дарослым.

Нэлі Тумаш, *Смаргонскі раён.*

Ад вядучай рубрыкі — наўздагон

Вы здагадаліся? Гэтай гісторыяй «Звязда» распачынае новы конкурс на найлепшую вясёлую ці цікавую... І адначасова — падводзіць вынікі старога. Пакуль в прэтэндэнтах на перамогу бываліцы Любові Чыгрынавай і Ніны Горгуль з Мінска, Алены Несцяронак з Докшыц, Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны, Тацяны Раманавай з Наваполацка, Віктара Сабалеўскага з Узды, Аляксандра Маскалевіча з Лельчыц, Фёдара Карпея з Мядзела... Прыгожая кампанія! Далучайцеся: гэта значыць, пішыце. І, вядома ж, выпісвайце — чытайце «родную газету на роднай мове»!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000007667 ад 30.04.2004. 220013. Мінск. праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 765. Індэкс 63850. Зак. № 78.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12